Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 207 (5881) | 8 верасня 1937 г., серада | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Нота пратэсту ўрада СССР ураду Італіі.

ПЕРАДАВЫЯ АРТЫКУЛЫ:

Да адказу зарваўшыхся фашысцкіх агрэсараў!

Узначаліць перадкастрычніцкае спаборніцтва.

У прэзідыуме ЦВК Саюза ССР

У Наркамаце замежных спраў.

Артыкулы: А. Стэцкі — Прапаганда выбарчага закона.

Разгром карнілаўскага мяцежу.

Гераічная старонка мінулага: Барадзінскі бой.

XXIII Міжнародны юнацкі дзень у БССР: Дэманстрацыя гарачай любві і адданасці справе комунізма, справе партыі Леніна—Сталіна.

Агляд друку: Каму патурае газета і каго прыкрывае яе рэдактар.

Р. Фралоў: Справы аднаго парткома.

Затрыманне японскага ўзброенага катэра ў совецкіх водах.

За рубяжом: На франтах у Іспаніі.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

З'езд фашысцкі шпіёнаў.

ДА АДКАЗУ ЗАРВАЎШЫХСЯ ФАШЫСЦКІХ АГРЭСАРАЎ!

Народы Совецкага Саюза сустрэнуць з велізарным задавальненнем паведамленне аб ноце пратэсту, накіраванай урадам СССР італьянскаму ўраду з поваду піратскіх нападаў італьянскіх ваенных караблёў на совецкія гандлёвыя судны.

Піратскія караблі падсцерагаюць на ўсіх шляхах ад Дарданел да Гібралтара мірныя гандлёвыя судны, якія плаваюць пад совецкім, англійскім, французскім, дацкім і іншымі нацыянальнымі флагамі. З асаблівай ярасцю абрушваюцца фашысцкія піраты на іспанскія гандлёвыя судны, прабуючы акружыць рэспубліканскую Іспанію кальцом блакады. Ворагі міру, і ў першую чаргу італьянскія фашысты, ператварылі Міжземнае мора, гэты важнейшы гандлёвы шлях, у арэну морскага разбою, у новы ачаг ваеннай небяспекі.

Піраты трусліва прабуюць замаскаваць свае разбойніцкія падводныя лодкі, зафарбоўваючы іх назвы. Прадажны фашысцкі друк сцвярджае, што напады на гандлёвыя судны, якія плаваюць па Міжземнаму мору, учыняюцца падводнымі лодкамі «невядомай нацыянальнасці». Гнусны маскарад, жалкія выкручванні!

Вядома, што ў распараджэнні іспанскіх мяцежнікаў няма падводных лодак. Усе падводныя лодкі іспанскага флота, як аб гэтым афіцыяльна заявіў законны ўрад Іспаніі, асталіся верны народу. Байкі аб тым, быццам у мяцежнікаў ёсць падводныя лодкі, зыкрываюцца хоць-бы тым, што карсары дзейнічаюць па велізарнай адлегласці ад іспанскага ўзбярэжжа, у прыватнасці, у турэцкіх водах. Зусім ясна таму, што падводныя лодкі і ваенна-морскія базы, на якія гэтыя лодкі апіраюцца, могуць належаць толькі фашысцкай Італіі. Нарэшце, каго могуць пераканаць запірацельствы італьянскіх фашыстаў, калі ў наяўнасці сведчанне капітана і ўсёй каманды цеплахода «Тимирязев», ясна бачыўшых на «невядомым» ваенным караблі адзначальныя знакі італьянскага ваеннага флота.

Увесь свет указвае на Рым, як на центр, адкуль атрымліваюць загады піратскія шайкі. Буржуазны друк Парыжа, Лондана, Нью-Ёрка даўно расшыфраваў нацыянальнасць «невядомых» карсараў.

Нота совецкага ўрада канчаткова зрывае маску з піратаў. Яна прыпазджае іх да ганебнага слупа.

У распараджэнні совецкага ўрада ёсць неабвержныя доказы таго, што піратскія дзеянні супроць совецкіх гандлёвых суднаў «Тимирязев» і «Благоев», а роўна і супроць многіх замежных параходаў былі зроблены італьянскімі ваеннымі караблямі. Фашысцкая Італія нясе прамую адказнасць за гэтыя страшэнныя злачынствы.

Совецкі ўрад з усёй рашучасцю звярнуў увагу ўрада фашысцкай Італіі на тую акалічнасць, што агрэсіўныя акты італьянскіх ваенных караблёў у адносінах да гандлёвых суднаў Совецкага Саюза знаходзяцца ў абураючай супярэчнасці не толькі з прынцыпамі гуманнасці, але і з самымі элементарнымі нормамі міжнароднага права. Бязапаснасць гандлёвага мораплавання з'яўляецца адным з асноўных палажэнняў агульнажыцця народаў.

Дзеянні італьянскіх агрэсараў знаходзяцца таксама ў прамой супярэчнасці з дагаворнымі адносінамі, існуючымі паміж Совецкім Саюзам і Італіяй. Наяўнасць паміж СССР і Італіяй нармальных дыпламатычных адносін, якія былі ўстаноўлены яшчэ ў 1924 годзе, сама па сабе пазбавіла-б выключыць магчымасць якіх-бы там ні было агрэсіўных дзеянняў Італіі ў адносінах да гандлёвых суднаў Совецкага Саюза. Да гэтага трэба, аднак, дадаць, што паміж СССР і Італіяй 2 верасня 1933 года быў заключан пакт «аб дружбе і ненападзе», які мае прамое абавязацельства старон не прыбягаць ні ў якім выпадку «ні да вайны, ні да якога-небудзь нападу на сушы, на моры, або ў паветры...» Напады італьянскіх ваенных караблёў на гандлёвыя судны СССР прадстаўляюць сабою, такім чынам, парушэнне Італіяй совецка-італьянскага пакта.

Італьянскія фашысты адважваюцца кінуць выклік вялікім морскім дзяржавам і дзесяткам малых дзяржаў, запікаўленых у бязапаснасці свайго гандлёвага суднаходства. Фашысцкія разбойнікі абнаглелі выключна дзякуючы патуранню агрэсіі з боку некаторых буржуазна-дэмакратычных дзяржаў. Нават зараз, калі прысяжныя апекуны фашызма сур'ёзна занепакоены пагрозай, якая стварылася для гандлёвага мораплавання на адкрытых морскіх шляхах, яны ўсё-ж не адважваюцца прапанаваць колькі-небудзь рашучыя меры да абуздання піратаў. У прыватнасці, англійскі кансерватыўны друк занят, галоўным чынам, пошукамі кампраміса з італьянскімі фашыстамі, не ўлічваючы таго, што ў фашысцкай Італіі апетыт прыходзіць у часе ежы. Развіццё італьянскай палітыкі з часу грабежніцкай вайны супроць абісінскага народа з асаблівай ясцю паказала, што кожная новая спроба кампраміса і ўступак агрэсару толькі заахвочвае яго да новых правакацый і новых актаў агрэсіі.

Совецкі Саюз у сазнанні сваёй непахіснай магутнасці можа адносіцца са спакойным прэзраннем да правакацый фашысцкіх авантурыстаў, яўна губляючых галаву. Агрэсарам прыдзецца пераканацца ў тым, што Совецкі Саюз не папярпіць піратскіх дзеянняў ваенных караблёў супроць гандлёвых суднаў, якія плаваюць пад флагам нашай радзімы.

Заяўляючы самы рашучы пратэст супроць нападу італьянскіх ваенных караблёў на гандлёвыя совецкія судны, урад СССР усклада разам з тым на італьянскі ўрад усю паўнату адказнасці за палітычныя і матэрыяльныя вынікі гэтых піратскіх нападаў. Само сабой зразумела, што ўсе страты, панесеныя Совецкім Саюзам і совецкімі грамадзянамі ў рэзультаце гэтых агрэсіўных дзеянняў, павінны быць аплочаны і віноўнікі агрэсіі павінны быць прыкладна пакараны.

Не выключана, што італьянскія фашысты нават зараз будуць прабаваць адмаўляць сваю адказнасць за піратскія патапленні совецкіх суднаў. Гэта голае адмаўленне неабвержных фактаў нікога, аднак, не пераканае. Міжнародная грамадская думка аднадушна прызнае, што «Тимирязев» і «Благоев», як і многія замежныя судны, патоплены італьянскімі ваеннымі караблямі. Не падлягае таксама сумненню, што склікаемая ў бліжэйшыя дні ў Швейцарыі канферэнцыя дзяржаў, зацікаўленых у бязапаснасці плавання на Міжземным моры, са свайго боку ўстаноўіць, што пагроза бязапаснасці мораплавання створана агрэсіўнымі дзеяннямі італьянскага ваеннага флота.

Фашысцкія агрэсары павінны зразумець, што яны запеялі ігру, багатую грознымі вынікамі. Працоўныя ўсяго свету, рабочыя і сяляне Італіі бачаць, хто правацыруе новую сусветную вайну.

Совецкія маракі і гандлёвыя судны СССР, плаваючыя ў іншаземных водах, не безабаронны. Вялікая совецкая радзіма, якая пасылае сваіх сыноў у плаванне, зможа агарадзіць іх ад зарваўшыхся разбойнікаў. Кожнае совецкае судно і кожны совецкі грамадзянін, дзе-б яны ні знаходзіліся, абаронены ўсёй магутнасцю Совецкага Саюза. Няхай запомняць фашысцкія піраты, што флаг суднаў СССР недатыкальны, як і кожная пядзь совецкай зямлі.

«ПРАВДА».

НОТА ПРАТЭСТУ ЎРАДА СССР УРАДУ ІТАЛІІ

Учора, 6 верасня г. г., пасольства СССР у Італіі, па даручэнню ўрада СССР накіравала міністру замежных спраў Італіі п. Чыано наступную ноту пратэсту:

«Пасольства Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік у Італіі звяртае ўвагу італьянскага ўрада на тое, што ў распараджэнні ўрада Совецкага Саюза ёсць не падлягаючыя сумненню доказы агрэсіўных дзеянняў італьянскіх ваенных суднаў супроць гандлёвых суднаў СССР. Указаныя дзеянні выразіліся ў патапленні італьянскім падводным судном совецкага судна «Тимирязев», следаваўшага з Кардыфа ў Порт-Саід з грузам вугалю і атакованага 30 жніўня г. г. у 22 гадзіны за 120 кілометраў на ўсход ад Алжыра. Такі-ж напад быў зроблен на совецкае судно «Благоев», якое накіроўвалася з Марыупаля ў Сетт з грузам пека для асфальта і патоплена 1 верасня г. г. у 6 гадзін 30 мінут, за 15 міль ад вострава Скірос.

Італьянскі ўрад, несумненна, улічыць, што гэтыя акты, учыненыя ў адносінах да плазаючых па адкрытых морскіх шляхах гандлёвых суднаў Совецкага Саюза, які падтрымлівае з Італіяй нармальныя дыпламатычныя адносіны, знаходзяцца ў абураючай супярэчнасці не толькі з прынцыпамі гуманнасці, але і з самымі элементарнымі і агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права. Разам з тым акты нападу італьянскіх суднаў па судны, якія плаваюць пад флагам СССР, парушаюць пакт, заключаны паміж СССР і Італіяй 2 верасня 1933 г. і прадугледжваючы ў артыкуле 1-м абавязацельства кожнай дагаварзаючайся страны перад другою «не зварачацца ні ў якім выпадку супроць яе, ні асобна, ні сумесна з адной або некалькімі трэцімі дзяржавамі, ні да вайны, ні да якога-небудзь нападу на сушы, на моры ці ў паветры...».

У сілу выказанага вышэй, пасольства СССР заяўляе італьянскаму ўраду ад імя і па даручэнню ўрада Саюза ССР самы рашучы пратэст.

Урад СССР усклада на італьянскі ўрад усю паўнату адказнасці за палітычныя, а таксама матэрыяльныя вынікі азначаных агрэсіўных дзеянняў італьянскіх ваенна-морскіх сіл у адносінах да гандлёвых суднаў, якія плаваюць пад флагам СССР.

Пасольства СССР упаўнаважана ўрадам Саюза ССР настойваць на рашучыя прасячэнні гэтай агрэсіі ў далейшым, і на поўным пакрыцці страт, панесеных у рэзультаце гэтых актаў Совецкім Саюзам, а таксама страт, панесеных маракамі названых совецкіх суднаў ці іх сем'ямі. Пасольства ўпаўнаважана таксама настойваць на прыкладным пакаранні асоб, віноўных ва ўчыненні памянёных агрэсіўных дзеянняў». (БЕЛТА).

У НАРКАМАЦЕ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

Французскае і брытанскае пасольствы ў СССР 6 верасня г.г. уручылі Народнаму камісарыяту замежных спраў ідэнтычныя ноты, змест якіх у асноўным зводзіцца да наступнага:

Французскі і брытанскі ўрады лічаць, што незаконныя напады на гандлёвыя судны, учыняемыя без папярэджання падводнымі лодкамі і самалётамі, якія скрываюць сваю нацыянальную прыналежнасць, стварылі на Міжземным моры падзвычай сур'ёзную сітуацыю і зрабілі неабходным склікание нарады міжземнаморскіх і іншых дзяржаў для абмеркавання стварыўшагася становішча і для прыняцця адпаведных мер. У сувязі з гэтым французскі і брытанскі ўрады выражаюць надзею, што СССР будзе прадстаўлен на нарадзе, склікаемай 10 гэтага верасня каля Жэневы ў складзе міжземнаморскіх дзяржаў: Італіі, Югаславіі, Албаніі, Грэцыі, Турцыі і Егіпта, чорнаморскіх дзяржаў: СССР, Румыніі і Балгарыі. Запрашэнне прыняць удзел у нарадзе накіравана таксама Германіі. У нотах адзначаецца, што нарада, у выпадку неабходнасці, зможа абмеркаваць пытанне аб эвентуальным запрашэнні іншых дзяржаў да ўдзелу ў наступнай стадыі работ нарады.

У адказ на памянёныя вышэй ноты Народны камісарыят замежных спраў 7 верасня г.г. накіраваў французскаму і брытанскаму пасольствам у СССР наступны адказ совецкага ўрада:

«Народны камісарыят замежных спраў, сведчачы сваё шанаванне французскаму і брытанскаму пасольствам, мае гонар падвердзіць атрыманне нот ад 6 верасня гэтага года, у якіх пасольствы, па даручэнню сваіх урадаў, давялі да яго ведама аб тым, што, на думку французскага і англійскага ўрадаў, неацярпімае становішча, узнікшае на Міжземным моры, у сувязі з незаконнымі нападамі на гандлёвыя судны, якія плаваюць пад флагам раду дзяржаў, патрабуе неадкладнай нарады і дзеянняў міжземнаморскіх, а таксама некаторых іншых дзяржаў. У тых-жа нотах французскі і англійскі ўрады выразілі надзею, што ўрад СССР будзе прадстаўлен на гэтай нарадзе, удзельнічаць у якой запрашаюцца міжземнаморскія дзяржавы: Італія, Югаславія, Албанія, Грэцыя, Турцыя і Егіпет, чорнаморскія дзяржавы: СССР, Румынія і Балгарыя, і акрамя таго, таксама і Германія.

Урад СССР, са свайго боку, лічыць, што напады некаторых і, ў першую чаргу, італьянскіх ваенных караблёў на гандлёвыя судны, якія плаваюць пад рознымі нацыянальнымі флагамі, павінны быць прызнаны абсалютна неацярпімымі і знаходзячыміся ў непрымірымай супярэчнасці з самымі элементарнымі нормамі міжнароднага права і з асноўнымі прынцыпамі гуманнасці. Зусім відавочна, што гэтыя агрэсіўныя дзеянні, учыняемыя на адкрытых морскіх шляхах і накіраваныя супроць мораплавання міралюбівых дзяржаў, ствараюць непасрэдную пагрозу еўрапейскай бязапаснасці і ўсеагульнаму міру.

У сілу сказанага, урад СССР гатоў прыняць удзел у нарадзе, якая склікаецца па ініцыятыве французскага і англійскага ўрадаў 10 верасня, і якая павінна будзе абмеркаваць пытанне аб мерах, здольных забяспечыць бязапаснасць плавання на адкрытых морскіх шляхах, якая прадстаўляе сабою адну з асноў міру.

Маючы на ўвазе, што на вышэйазначанай нарадзе будуць прадстаўлены дзяржавы, непасрэдна звязаныя з басейнам Міжземнага мора, урад СССР просіць урады Англіі і Францыі, як ініцыятараў міжземнаморскай нарады, растлумачыць яму матывы, у сілу якіх на гэту нараду запрашаецца Германія, якая, як вядома, такой дзяржавай не з'яўляецца.

Разам з тым, урад СССР думае, што да ўдзелу ў нарадзе 10 верасня павінен быць цяпер-жа прыцягнут і ўрад іспанскай рэспублікі, як у сілу таго факта, што Іспанія з'яўляецца міжземнаморскай дзяржавай, так яшчэ больш і таму, што інтарэсы Іспанскай рэспублікі асабліва сур'ёзна парушаюцца агрэсіўнымі дзеяннямі піратскіх ваенных караблёў».

(БЕЛТА).

УЗНАЧАЛІЦЬ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СПАБОРНІЦТВА

6 верасня ў «Звяздзе» была апублікавана пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб развіцці стахanаўскага руху ў сувязі з падрыхтоўкай да 20-й гадавіны Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Гэта пастанова знойдзе самы жывы водгук сярод стахanаўцаў прадпрыемстваў і ўсіх працоўных.

За 9 дзён, якія прайшлі з часу, як ініцыятары стахanаўскага руху ў прамысловасці БССР высунулі ідэю перадкастрычніцкага спаборніцтва, ужо ўзнялася вялікая хваля новага творчага ўзьдыму на фабрыках і заводах нашай рэспублікі.

У рэдакцыю паступаюць шматлікія паведамленні аб уключэнні ўсё новых прадпрыемстваў у социялістычнае спаборніцтва, аб бліскучых рэзультатах барацьбы за выкананне ўзятых абавязацельстваў асобнымі рабочымі.

Стахanавец завода «Большэвік» тав. Екельчык, змагаючыся за выкананне ўзятага абавязацельства ў пісьме ініцыятараў стахanаўскага руху, у апошнія дні значна ўзняў прадукцыйнасць працы. Калі раней сярэдняя выпрацоўка яго складала 145 проц. нормы, то зараз ён дасягнуў 193 проц.

Рабочыя завода імя Кірава Чайкоўскі, Пашыс, Гардзіенка, Худзікаў, Шаркуноў і інш., уключыўшыяся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, з дня ў дзень павышаюць сваю выпрацоўку, дасягаючы 280—290 проц. нормы.

Аднак, гэты масавы рух, які зараз з новай сілай пачынае разгортвацца знізу, толькі тады будзе мець поспех, калі яго своечасова ўзначаляць кіраўнікі заводскіх арганізацый і наркаматаў, калі гэтаму выдатнаму руху будзе аддана патрэбная ўвага і дапамога. Між тым, якраз кіраўніцтва социялістычным спаборніцтвам і стахanаўскім рухам зусім недастаткова. У некаторых месцах рэшткі трацкісцка-правых шкоднікаў свядома зрываюць разгортванне гэтага руху, а ў іншых месцах сядзяць кіраўнікі-шляпы, якім зорагі падказалі глушыць стахanаўскі рух, і яны, не разабраўшыся, «добрасумленна» выконваюць іх шкодніцкі заказ.

Паказальным прыкладам у гэтых адносінах можа служыць менскі завод імя Кірава і фабрыка імя Кагановіча.

Ініцыятары стахanаўскага руху ў БССР у сваём пісьме, апублікаваным у «Звяздзе», абвінавачвалі кіраўнікоў фабрыкі імя Кагановіча (Кліорына, Гефена і Татарскага) у адрыве ад стахanаўцаў, у занядзе стахanаўскага руху. Кіраўнікі-большэвікі павінны былі-б зрабіць для сябе патрэбныя вывады і скарыстаць пісьмо ініцыятараў-стахanаўцаў для сапраўднага ўздыму социялістычнага спаборніцтва ў сябе на фабрыцы. Але ім, як відаць, гонар мундзіра даражэй за справу. Яны накрыўдзіліся за крытыку і рашылі ўтаіць ад рабочых гэта пісьмо, не абмеркаваўшы яго ў цэхах і па сёння. Ці не ясна, што гэтыя кіраўнікі сталі на няправільны, антыпартыйны шлях?

Або ўзяць завод імя Кірава. Тут да апошняга часу стахanаўскі рух быў згорнут. Колькасць стахanаўцаў рэзка зменшылася. Былы дырэктар завода Сарокін прапаздраваў варожую «тэорыю», што быццам рост стахanаўскага руху цяпер не магчымы. Гэты антысовецкі паклёп на стахanаўскі рух служыў яму прыкрыццём бяздзейнасці і ігнаравання патрабаванняў стахanаўцаў. Ён не клапаціўся аб стварэнні ўмоў стахanаўцам, не выконваў іх каштоўныя прапановы. Ён, напрыклад, ніяк не мог арганізаваць учот выпрацоўкі стахanаўцаў. Але варта было зняць з работы гэтага дырэктара, як літаральна праз некалькі дзён справа пасунулася наперад: учот выпрацоўкі наладзілі, з'явіліся рэкорды, пачало разгортвацца спаборніцтва. Гэта пацвярджаецца і практыкай завода «Ударнік». Тут у часе правядзення стахanаўскага дня пры тых-жа ўмовах, як і раней, але пры большай арганізаванасці і дысцыпліне, пры большай увазе да людзей рэзка ўзнялася выпрацоўка.

Гэтыя факты з усёй наглядзнасцю паказваюць, што віна за аслабленне росту стахanаўскага руху, як і за невыкананне промфінплана прадпрыемствамі ляжыць толькі на людзях, пастаўленых на чале кіраўніцтва даным канкрэтным участкам работы. Людзі рашаюць, ад іх залежыць поспех або правал таго ці іншага мерапрыемства. Аб'ектыўных прычын ніякіх няма.

На шматлікіх прыкладах паказвалі гэта і стахanаўцы ў сваіх прамовах на нарадзе аб разгортванні перадкастрычніцкага спаборніцтва, якая адбылася 3 верасня ў рэдакцыі «Звязды». Заяўляючы аб сваім гарачым жаданні бесперапынна павышаць социялістычную прадукцыйнасць працы, сустрэць кастрычніцкія святы новымі перамогамі, выступаўшыя называлі канкрэтных зіноўнікаў, зрываючых іх поспехі.

Якія асноўныя вывады можна зрабіць з выступленняў стахanаўцаў на гэтай нарадзе?

Амаль усе выступаўшыя ў адзін голас заяўлялі, што іх прадукцыйнасць зніжае дрэнная арганізацыя працы, масавыя прастоі з-за таго, што непаваротлівыя і бязрукія кіраўнікі не здольны загадзя падрыхтаваць ім патрэбныя матэрыялы і інструменты. На многіх прадпрыемствах спынілі весці ўчот і вывешваць паказальнікі выпрацоўкі стахanаўцаў. Не лічацца з іх думкай. Прапановы вытворчых нарад не выконваюцца.

А трэба-ж прама сказаць, што калі-б нашы кіраўнікі прадпрыемстваў і наркаматаў часцей раліся са стахanаўцамі і выконвалі іх каштоўныя ўказанні, работа ішла-б куды лепш.

Многа скарг на недахопы ў арганізацыі сістэмы аплаты працы. У радзе месц кіраўнікі прадпрыемстваў не займаюцца гэтым пытаннем, не скарыстоўваюць гэты важнейшы вагар для ўзьдыму прадукцыйнасці працы, палкам перапісваючы яго другарадным работнікам з тарыфна-нарміровачных бюро. У рэзультаце бываюць такія абуравючыя выпадкі, як расказвалі на нарадзе стахanаўцы фабрыкі «Кастрычнік», імя Крупскай, завода «Ударнік» і інш., калі малакваліфікаваныя рабочыя атрымліваюць больш, чым высокакваліфікаваныя. Зусім натуральна, што існаванне такой блытаніны ў сістэме зарплаты не стымулюе рост прадукцыйнасці працы і павышэнне тэхнічнай кваліфікацыі.

Выступаўшыя на нарадзе таварышы ўзнялі пытанне аб новых стахanаўцах. Справа ў тым, што на многіх прадпрыемствах кіраўнікі лічаць стахanаўцамі толькі тых, хто працуе стахanаўскімі металамі па году і больш, не заўважаючы, што за апошні час выраслі новыя стахanаўцы, якія маюць патрэбу ў падтрымцы і дапамозе. З другога боку ёсць многа рабочых, жадаючых стаць стахanаўцамі. Ім таксама трэба дапамагчы, але кіраўнікі, інжынерна-тэхнічныя работнікі ў многіх месцах самаўхіляюцца ад тэхнічнай дапамогі рабочым і не арганізоўваюць распаўсюджвання стахanаўскага вопыту работы.

Жорсткай крытыцы стахanаўцы падвергалі кіруючых работнікаў наркаматаў. Яны справядліва патрабавалі ад іх палянпшэння жывой сувязі са стахanаўцамі. Гэта патрабаванне павінна быць выканана. Наркаматы павінны неадкладна прыняць меры да выканання пастановы бюро ЦК КП(б)Б — правесці неабходныя практычныя мерапрыемствы па разгортванню стахanаўскага руху, арганізаваць дапамогу стахanаўцам у выкананні ўзятых імі абавязацельстваў.

Зараз у раёнах, паводле пастановы ЦК КП(б)Б, павінны адбывацца сходы стахanаўцаў. Гэтыя сходы партыйныя, профсаюзныя арганізацыі і наркаматы абавязаны скарыстаць для яшчэ больш высокага ўзняцця хвалі социялістычнага спаборніцтва, для выяўлення і ліквідацыі тормазаў у рабоце стахanаўцаў. Сходы павінны з'явіцца моцным штуршком у ператварэнні перадкастрычніцкага спаборніцтва ў сапраўды масавы народны рух.

Задача партыйных і профсаюзных арганізацый, кіраўнікоў наркаматаў і прадпрыемстваў — па-сапраўднаму ўзначаліць рух за дастойную сустрэчу 20-й гадавіны Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, ачысціць гэтаму руху шлях ад трацкісцка-бухарынскіх наймітаў і салдзейнічаць пашырэнню стахanаўскага руху ўшыр і ўглыб.

ЗАМЕЖНЫЯ ВОДГУКІ НА СОВЕЦКУЮ НОТУ ІТАЛІІ

ЖЭНЕВА, 7 верасня. (БЕЛТА). У колах Лігі нацый паведамленне аб совецкай ноце Італіі выклікала сенсацыю. Тэкст ноты яшчэ не апублікован у мясцовых газетах, якія пакуль прыводзяць тэндэнцыйныя паведамленні з Рыма «аб совецкай спробе ўзарваць канферэнцыю міжземнаморскіх дзяржаў» і аб «чакаючымся разрыве дыпламатычных адносін паміж СССР і Італіяй». З некаторых французскіх крыніц, якія займаюць здаўна антысовецкую пазіцыю, выходзяць таксама тэндэнцыйныя чуткі аб «вялікім нездавальненні ў Лондане».

Не гледзячы на ўсе гэтыя правакацыйныя чуткі, у колах Лігі нацый выказваюць задавальненне совецкім выступленнем, якое зрывае гнілую спробу замаскіраваць агрэсара і тым самым пакінуць яму далейшую свабоду дзеянняў. Выказваюць задавальненне таксама і таму, што пасля ноты СССР нікому не ўдасца заглушыць палітычную дыскусію аб агрэсіі ў Міжземным моры на Совеце і на пленуме Лігі нацый, як некаторыя разлічвалі. З вялікай цікавасцю чакаюць далейшых шагоў совецкага ўрада. З прычыны адмаўлення італьянскага ўрада задаволіць законныя патрабаванні СССР, чакаюць пяпер звароту СССР да Лігі нацый.

МАСАВЫЯ АРЫШТЫ Ў ПОЛЬШЧЫ

ПРАГА, 6 верасня. (БЕЛТА). Добра інфармаваная аб падзеях, якія адбываюцца ў Польшчы, газета «Венков» піша, што, у сувязі з агульнай забастоўкай сялян, у Польшчы арыштавана звыш тысячы сялян і рабочых, якія прымалі ўдзел у гэтай забастоўцы, а таксама дзеячоў сялянскай партыі «Строніцтва людове».

ДЗВЕ З ПАЛОВАЙ НОРМЫ ЗА ЗМЕНУ

ЖЛОБІН. Рабочыя лесазавода Веткавір за апошнія дні значна павялічылі сваю выпрацоўку. Стахanаўцы змены дзесятніка Казлова — Маркоўскі Браніслаў, Міневіч А., Паўловіч М. — на цыркулярных сталах па рэзцы клёпак сістэматычна выконваюць свае нормы ў 2—2½ разы і больш.

Днямі Маркоўскі сумесна з Вінарскім А. распілавалі за змену 5,62 кубаметра лесаматэрыялу замест нормы ў 2 кубаметры.

М. БЕРАСНЁЎ.

На дэманстрацыі, прысвечанай XXIII Міжнароднаму юнацкаму дню, у Менску.

Фото С. Грына і Я. Салавейчыка.

XXIII МІЖНАРОДНЫ ЮНАЦКІ ДЗЕНЬ У БССР

ДЭМАНСТРАЦЫЯ ГАРАЧАЙ ЛЮБВІ І АДДАНАСЦІ СПРАВЕ КОМУНІЗМА, СПРАВЕ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

МАЛАДОСЦЬ І СІЛА

Гэтай раніцай горад асабліва выглядаў па-святочнаму. Упрыгожаныя вуліцы напаўняліся бадзёрымі песнямі і музыкай.

Пляц Леніна. На фасадзе Дома ўрада ва ўвесь рост узнімаецца партрэт любімага правадыра таварыша Сталіна. Ніжэй—пад ім вызіяляецца сваёй яркасцю кумачовы лозунг: «XXIII Міжнародны юнацкі дзень».

Роўна 12 гадзін. На трыбуне з'яўляюцца кіраўнікі партыі і ўрада БССР. Пачынаецца марш маладосці, сілы і хараства.

Прыгожай песенькай «Эй, вратарь, готовься» аркестр спаткаў першую калону Сталінскага раёна. Над калонай узвышаюцца зробленыя з кветак партрэты правадыроў Леніна—Сталіна, за імі ўзнімаюцца ўгару алыя сцягі, якія пераліваюцца на сонцы прывабнымі фарбамі, ствараючы ўражанне велічы і магутнасці. Іх нясуць лепшыя стаханаўцы станкабудаўнічых заводаў імя Варашылава і Кірава.

Па вуліцах і пляцах Менска моладзь нясе кветкі, сотні лозунгаў і плакатаў, адлюстроўваючых веліч нашай эпохі, таржаство справы Леніна—Сталіна, выражаючых гарачую любоў і патрыятызм працоўных да сваёй соцыялістычнай радзімы, любоў да вялікага Сталіна, сваю бранкую салідарнасць з працоўнымі масамі ўсяго свету.

«Жыць стала лепш, жыць стала весялей» — залатымі літарамі гораць словы, азначаючыя прыгожае, радаснае жыццё совецкага народа. Тысячкратна паўтараюцца на снягах свяшчэнныя словы Сталінскай Канстытуцыі, адлюстроўваючы выдатныя перамогі соцыялізма: «Грамадзяне СССР маюць права на працу, на асвету, на адпачынак». У гэтым пункце Канстытуцыі гучыць велічная музыка нашых поспехаў, нашага росту і магутнасці. Некаторыя плакаты прысвечаны гераічнай рэспубліканскай Іспаніі, якая вядзе барацьбу супроць азвярэлага фашызма за сваю незалежнасць.

У азіным парыве бязмежнай любві да радзімы дэманструе моладзь сваю гатоўнасць да абароны сваіх дасягненняў. Гіганцкі мастацка афармлены макет «Ежовы рукавицы» грозна гаварыў аб пільнасці і магутнасці совецкага народа і яго слаўнай разведкі. Добрыя і трапныя карыкатуры. Яны, як куля, пранізваюць ворагаў народа. Вось набліжаецца велізарны макет «Граніца на замку». На бартах машыны вялікія мастацкія панно, у якіх паказваецца як піонер дапамог пагранічнікам затрымаць дыверсантаў. Макет фашысткіх турм і шыбеніц наглядна паказвае совецкай моладзі, што нясе фашызм працоўным. У гэтым макеце выказвае моладзь сваю нянавісць да здрадніка ў радзімы, подлых забойцаў і рэстаўратараў капіталізма, трацкісцка-бухарынскай зграі, якія імкнуліся пазбавіць нашу моладзь шчасця, песень і радасці.

Адна калона змяняецца другой. Цудоўныя кветкі, гірлянды, мастацкае афармленне. Але больш за ўсё прыгожа наша моладзь — моцная, бадзёрая, здаровая.

Трыбуна бурна апладыруе выступаючым на плошчы студэнтам.

Жыццерадасныя юнакі і дзяўчаты — будучыя тэхнікі, інжынеры, урачы, педагогі — нясуць макеты зямнога шара. На вяршыні свету, дзе Паўночны полюс, знаходзіцца совецкі самалёт. Услед за ім нясуць прыгожа зробленыя партрэты адважных лётчыкаў — Чкалава, Громава, Юмашова. Калону ўпрыгожваюць гіганцкія тамы класікаў марксізма-ленінізма.

«Няхай жыве лепшы друг моладзі таварыш Сталін»—даносіцца голас з трыбуны. Як наэлектрызаваная хваля «Ура» праносіцца па ўсіх калонах. Моладзь з радасцю вітае таго, хто выкаваў непахісную жалезную магутнасць краіны, хто ператварыў яе ў непрыступную крэпасць, якая служыць пролетарыяту заходніх краін факелам для перамогі. Яму—правадыру і настаўніку народаў — совецкая моладзь выказвае сваю шчырую падзяку.

Радасць, музыка і вяселле, якія даносіліся з калон, не змяшчаліся на гэтым пляцу. Яны ўзніміліся над пляцам і разносіліся па ўсяму гораду.

У розное адзенне ўбралася моладзь праходзяць украінцы, каўказцы, іспанцы. Кожная з гэтых груп дэманстрантаў затрымліваецца па некалькі хвілін перад трыбунай і пры гуках аркестра і гармоніка пускаецца ў танцы. Пасля беларускай «Лявоніхі» ідзе украінскі «Гапак», пасля грузінскай лязгінкі ідзе рытмічны іспанскі танец. З трыбуны раздаюцца гарачыя апладысменты.

Зноў калоны ў руху. Песня акружаны маладымі патрыётамі набліжаецца да трыбуны вялікі партрэт таварыша Сталіна. Адзін за адным раздаюцца зоклічы з трыбуны: «Няхай жыве таварыш Сталін!», «Няхай жыве таварыш Кагановіч!». Тысячы рук высока падымаюць букеты кветак, горача вітаюць аднаго з саратнікаў таварыша Сталіна. «Няхай жыве таварыш Ежоў!». Моладзь з радасцю вітае слаўнага ордэнаноснца-сталінца, пад кіраўніцтвам якога Народны камісарыят унутраных спраў паспяхова ачышчае нашу прыгожую зямлю ад шпіёнаў і дыверсантаў.

Каля дзух гадзін нясцынным патокам ішла працоўная моладзь ордэнаносная сталіцы, дэманструючы сваю вернасць партыі, правадыру працоўных усяго свету таварышу Сталіну, бязмежную любоў да сваёй радзімы, гатоўнасць у любы момант стаць на абарону сваіх заваёў і знішчыць зорагаў пролетарыята.

* * *

У 17 гадзін 45 мінут пад гукі фізкультурнага марша на зялёным полі стадыёна «Дынама» імя Кірава з'яўляюцца рознакаляровыя шоўкавыя сцягі спартыўных таварыстваў. Пачынаецца парад. Перад трыбунамі стройным радамі праходзяць удзельнікі трэцяй усебеларускай калгаснай спартакіяды. Яны нясуць сцяг таварыства «Ўраджай». Уперадзе ідуць пераможцы другой калгаснай спартакіяды — фізкультурнікі калгасаў «Чырвоныя Скарынічы» (Менскі раён) і «КІМ» (Хойнікі). За імі слетуюць каманды Магілёўскага, Слуцкага, Мозырскага і іншых раёнаў рэспублікі. Усе яны разам з фізкультурнікамі Менска выстраіліся перад трыбунамі. Адбыўся кароткі мітынг.

Пачынаюцца спартыўныя выступленні. Каманда рэспубліканскай гімнастычнай школы па-майстэрску выканала практыкаванні на турніках і брусях. Захапленне глядачоў выклікалі выступленні 100 дзяцей піонерскага лагера работнікаў НКВД. У блакітных трусах і майках яны выконвалі вольныя рухі, рытмічныя танцы, прыгожыя пірамілы. Па бегавой дарожцы лепшыя бегуны рэспублікі тт. Лобік, Ліпніцкі, Лавецкая, Мігурскі і іншыя рабілі паказальныя забегі.

Свята закончылася сустрэчай футбольных каманд Трохгорнай мануфактуры (Масква) і зборнай Менска.

На дэманстрацыі, прысвечанай XXIII Міжнароднаму юнацкаму дню, у Менску.
Фото С. Грына і Я. Салавейчыка.

У ПАРКУ ІМЯ ГОРКАГА

З раніны, калі дарослыя рыхтаваліся да ўрачыстага марша, вясёлая дзетвара сабралася ў менскім парку імя Горкага. Тэрыторыя парка святочна ўпрыгожана.

Гул выпушчаных ракет абвяшчаў аб пачатку дзіцячай масоўкі, прысвечанай Міжнароднаму юнацкаму дню. У розных канцах парка пяць аркестраў адначасова выканалі марш «Веселых ребят».

У распараджэнне дзетвары было аддана ўсё: масавыя пляцоўкі, тэатры, атракцыёны. На пляцоўках дзеці выконвалі масавыя песні і танцы, былі наладжаны розныя гульні. У памяшканні Летняга і Зялёнага тэатраў сіламі артыстаў даяржаўнай эстрады, цырка і дзіцячых самадзейных гурткоў быў дан вялікі канцэрт.

У ГАРАДАХ І РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

ВІЦЕБСК. З вялікім ўздымам прайшла дэманстрацыя ў гонар XXIII Міжнароднага юнацкага дня. З фабрык і заводаў, з совецкіх і навучальных устаноў моладзь прышла на дэманстрацыю, каб выказаць сваю адданасць большэвіцкай партыі, мудраму правадыру народаў — вялікаму Сталіну.

Дэманстрацыю адкрывае калона дзяцей. Радасная дзетвара з партрэтамі Леніна і Сталіна, з букетамі жывых кветак праходзіць міма трыбуны. Раздаюцца воклічы: «Дзякуй таварышу Сталіну за шчаслівае дзяцінства», «Няхай жыве наш лепшы настаўнік — вялікі Сталін».

З песнямі ідуць вучлёты аэраклуба. Яны нясуць лозунгі і плакаты, на якіх залатымі літарамі напісаны словы прывітання вялікаму Сталіну, прывітанні сталінскім пітомцам—героям сталінскіх маршрутаў.

Ідуць чыгуначнікі, металісты, абутнікі, трыкатажніцы, швейнікі, студэнты, урачы.

Дэманстрацыю замыкалі комсамольцы Чырвонай арміі.

Сёлета ў дэманстрацыі ўдзельнічала каля 20 тыс. чалавек.

* * *

ГОМЕЛЬ. Жыццерадасная моладзь весела і бадзёра сустракала свята — XXIII Міжнародны юнацкі дзень. На гарадскую плошчу хлынулі патокі моладзі. У радах дэманстрантаў многа дарослых. Калі плошча запоўнілася масай святочна апранутых і радасных людзей, адбыўся шматлюдны мітынг. Моладзь Гомеля выказала вялікае дзякуй лепшаму другу моладзі таварышу Сталіну за шчаслівае юнацтва, бязмежную адданасць радзіме.

Па вуліцы крочылі стройныя калоны дэманстрантаў упрыгожаныя лозунгамі і партрэтамі правадыроў партыі і ўрада.

Дзве гадзіны прадаўжалася дэманстрацыя. Моладзь Гомеля яшчэ раз дэманстравала сваю адданасць справе Леніна-Сталіна, сваю гатоўнасць змагацца за справу комунізма.

МАГІЛЕЎ. Песні і музыка аркестраў напоўнілі горад. Па яго ўпрыгожаных вуліцах учора моладзь дэманстравала сваю баявую гатоўнасць, сваю адданасць партыі Леніна—Сталіна.

Жыццерадасная дзетвара несла безліч букетаў кветак, партрэты любімага Сталіна і яго саратнікаў. Чэканным крокам ідуць комсамольцы Чырвонай Арміі. Побач з імі ідуць стройныя рады парашутыстаў і асоавіяхімаўпаў. Рознакаляровымі шоўкавымі лентамі ўпрыгожана калона рабочых шоўкавай фабрыкі. На вялікім мастацкім панно адлюстраваны легендарныя палёты сталінскіх сокалаў праз Паўночны полюс. У калоне аўтарамонтнага завода рухаліся 10 прыгожа афармленых пажарыскіх аўтамашын.

У дэманстрацыі прынялі ўдзел каля 10 тысяч чалавек.

* * *

БАРЫСАЎ. Каля 10 тысяч юнакоў і дзяўчат выйшлі на дэманстрацыю ў дзень XXIII Міжнароднага юнацкага дня. У 4 гадзіны дня вуліцы горада запоўніліся дэманстрантамі. Ярка афармлены калоны. У дзіцячай калоне — групы запейнікаў, апранутыя ў нацыянальныя касцюмы. Гучэла бадзёрая песня шчаслівай совецкай моладзі.

У летнім тэатры Новабарысаўскага парка дзеці дэманстравалі сваю мастацкую самадзейнасць.

* * *

КАПАТКЕВІЧЫ. У гонар XXIII Міжнароднага юнацкага дня 29 юнакоў зрабілі велапрабег па маршруту Капаткевічы — Петрыкаў — Капаткевічы. 6 верасня ўсе ўдзельнікі прабегу прыбылі ў Капаткевічы і прынялі ўдзел у свяце. На сталыёне адбыўся мітынг моладзі мястэчка і суседніх калгасаў. Пасля мітынга адбыліся фізкультурныя выступленні. У стралковым ціры прызыўнікі-комсамольцы спаборнічалі на лепшую стральбу.

НА ВАХЦЕ СТАЯЛІ ЛЕПШЫЯ ПАГРАНІЧНІК'-КОМСАМОЛЬЦЫ

З вялікім уздымам святкавалі слаўныя пагранічнікі Міжнародны юнацкі дзень. Ахоўваць заходнія граніцы Совецкага Саюза ў гэты дзень выйшлі лепшыя комсамольцы-пагранічнікі.

На вахту стаў пагранічнік Якаў Лебедзеў (пагранатрад палкоўніка Гараніна). Былы данецкі шахцёр комсамолец Лебедзеў — выдатнік баявой і палітычнай вучобы, за апошні час затрымаў двух агентаў замежных разведак.

У заставе імя тав. Ежова права стаць на вахту ў дзень баявога свята моладзі атрымаў былы стаханавец Крэматорскага завода комсамолец Фёдар Карчагін.

Баец чырвонасцяжнага пагранатрада, якім камандуе маёр тав. Марозаў, комсамолец Селігей нядаўна затрымаў шпіёна адной з суседніх дзяржаў. Адважны баец— былы калгаснік Селігей з гонарам ахоўваў свяшчэнныя граніцы Совецкага Саюза.

(БЕЛТА).

ДА ЧАГО ВЯДЗЕ САМАСУПАКОЕНАСЦЬ БАРЫСАЎСКІХ КІРАЎНІКОЎ

Своечасовае і добраякаснае правядзенне азімай сяўбы — з'яўляецца гарукай атрымання багатага ўраджаю. Аднак гэтага не хочуць зразумець кіраўнікі Барысаўскага раёна.

Сяўба азімых тут зрываецца. Раён да гэтага часу нават не падрыхтаван да сяўбы. Так, на 1 верасня г. г. у калгасах вывезена гною на поле пад азімыя культуры ўсяго толькі 2.215 вазоў або 2 процанты к устаноўленаму плану. Большасць калгасаў раёна яшчэ не прыступілі да вывазкі гною. Мінеральныя ўгнаенні таксама не вызозяцца са складаў сельгасснаба. Больш 15 калгасаў раёна не вывозяць нават выкупленыя ўгнаенні. 70 тон мінеральных угнаенняў валяецца пад адкосамі чыгункі і псуецца.

Насенне для азімай сяўбы таксама не намалочана і не падрыхтавана.

У выніку, на 1 верасня па раёну пасеяна азімай пшаніцы ўсяго толькі 12 гектараў або 2 проц. плана. Жыта 5.520 гектараў або 39 проц. плана. Сяўба зачастую праводзіцца па няўгноенай і дрэнна апрацаванай глебе.

У калгасах Глівенскага, Новасельскага і Забышэўскага сельсоветаў яшчэ не прыступілі да азімай сяўбы. У калгасе «Чырвоная змена», Зембінскага местачковага совета, па віне старшыні калгаса Мароза яшчэ і зараз не падрыхтавана глеба і насенне для сяўбы. Да вывазкі гною і торфу на поле тут яшчэ не прыступілі.

Такое-ж становішча з азімай сяўбой і ў калгасе імя Розы Люксембург, Чарнявіцкага сельсовета. Тут выяўлен факт яўнага шкодніцтва. У часе малацьбы жыта на насенне ў барабан малатарні разам са снопам быў падан кавалак жалеза, у выніку малатарня выбыла са строю.

Аналагічны факт меў месца і ў калгасе «Хваля рэволюцыі», Лошніцкага сельсовета, дзе ў часе малацьбы жыта на насенне ў барабан малатарні быў падан звязак пяці мяшкоў. Малатарня выведзена са строю, а калгас астаўся не забяспечан насеннем для азімай сяўбы.

У калгасе імя Чапаева пасеяна азімых 6 гектараў замест 251 гектара па плану. Гной і торф не вывозіўся на поле. Калгасам фактычна кіруе не праўленне калгаса і не старшыня Баярэвіч, а рахункавод Кашлюк, у мінулым кулак, які заяўляе, што «спяшацца з азімай сяўбой няма куды».

Загадчык райземаддзела Каплан замест кантролю за ходам сяўбы ў калгасах адседжваўся ў канцылярыі райземаддзела. Яго прыкладу следуюць і астатнія работнікі райземаддзела.

Прыямінская МТС сваёй работай не забяспечыла своечасовую падрыхтоўку і правядзенне азімай сяўбы ў абслугоўваемых ёю калгасах. Выпуск з рамонту пашкоднічку адрамантаваных трактараў і вывад са строю малатарань у часе работы не з'яўляюцца тут выпадковай справай.

Дырэктарам Прыямінскай МТС працуе нехта Дазідоўскі — дэзертыр Чырвонай Арміі і буйнейшы падрадчык старога часу. Старшым механікам МТС працуе Джулей Пракоп — уладар буйных прадпрыемстваў, брат яго расстрэлян за падрыўную работу. На пасадзе агранома знаходзіцца трацкіст Сабалеўскі Аляксей. Гэта група чужакоў да апошняга часу праводзіць сваю работу ў МТС, накіраваную на зрыў заданняў партыі і ўрада.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што шкодніцкая работа ў сельскай гаспадарцы Барысаўскага раёна прадаўжаецца і зараз стаўленікамі польскіх шпіёнаў і дыверсантаў.

Старшыня райвыканкома Рэкспін і сакратар райкома Бардзіянаў замест ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, выкрыцця і вытнання ворагаў народа праяўляюць палітычную слепоту, самасупакоенасць і дабрадушнасць.

ВІЗНЕР С. К.

ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА СЯЎБЫ АЗІМЫХ

Злачынна запятваецца сяўба азімых па калгасах Менскага раёна. План па раёну па першае верасня выканан толькі на 24 проц. Толькі зараз, калі мінулі ўрадавыя тэрміны, многія калгасы распачынаюць сяўбу, але і то маруцца і неарганізавана.

Па калгасах Дзержынскага сельсовета да першага верасня было засеяна толькі 34 гектары. Але і зараз як след сяўба яшчэ не разгарнулася. У калгасе «Ленінскі шлях» нават не падрыхтавана глеба, узарана толькі 21 гектар з патрэбных 145 гектараў.

Не лепшае становішча з сяўбой у калгасе «Большавіцкая сяўба» і «Комінтэрн». Кіраўніцтва сельсовета (старшыня т. Валковіч) і дырэктар Дзержынскай МТС тав. Мінін не адчуваюць адказнасці за ўраджай будучага года. Яны самаўхіліліся ад гэтай работы, перадаверыўшы сяўбу старшыням калгасаў. Апошнія, выкарыстоўваючы адсутнасць кантролю з боку раённых арганізацый і сельсовета, злачынна запятваюць сяўбу.

Не мабілізаваны таксама калгаснікі Новасёлкаўскага сельсовета на барацьбу за сталінскі ўраджай. Па калгасах сельсовета план сяўбы выканан усяго на 9 проц. Па калгасу імя Чапаева пад сяўбу падрыхтавана ўсяго 2 гектары глёбы.

На апошнім пленуме сельсовета (31 жніўня) тэрміны сяўбы шкодніцка былі працягнуты да 10 верасня. Гэта робіцца ў той час, калі ёсць усе магчымасці завяршыць сяўбу на працягу не больш 3—4 дзён.

Па Негарэльскаму сельсовету сяўба пушчана на самацёк. Тут толькі на 2 проц. выканан план сяўбы. Па Грычанскаму, Новадворскаму і Дабрынёўскаму сельсоветах на першае верасня не засеяна ні аднаго гектара.

Такое становішча з ходам сяўбы па раёну яскрава сведчыць аб тым, што райком партыі і райвыканком яшчэ не зрабілі для сябе палітычных вываадаў з пастановы партыі і ўрада аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў калгасным будаўніцтве і не ўзначалілі барацьбы калгасных мас раёна за будучы ўраджай.

МЕНСКІ.

АДНААСОБНІКІ НЕ ВЕДАЮЦЬ ДЗЕ СЕЯЦЬ

Аднаасобнікі Кавалеўскага сельсовета (Бабруйскі раён) да гэтага часу не ведаюць дзе сеяць азімыя. Старшыня сельсовета Рымбург усё яшчэ не адвёў ім зямлю. Кожны дзень аднаасобнікі прыходзяць у сельсовет да Рымбурга пытаць дзе ім сеяць. Але адказ заўсёды паступае адзін: «Пачакайце, выеду, там і ўкажу, дзе вам сеяць».

Гэта «чаканне» давяло да таго, што ні адзін аднаасобнік не пачаў апрацоўваць нават глебу пад сяўбу.

Рымбург ні аднаго схода не правёў з аднаасобнікамі па растлумачэнню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб прадастаўляемых льготах аднаасобнікам пры ўступленні іх у калгасы.

КАЛГАСНІК.

ДРАПЕЖНІЦКІЯ АДНОСІНЫ ДА КОНЕЙ

Ворагі народа імкнуцца вывесці са строю конскае пагалоўе. Гэта шкодніцкая дзейнасць прыняла шырокі характар у Дубровенскім раёне.

У многіх калгасах назіраюцца драпежніцкія адносіны да коней. Па матэрыялах страхавой інспекцыі райфінаддзела ў калгасе «Авангард», Расасенскага сельсовета, паў конь ад прабою грудной клеткі плугам. У калгасе «Ударнік», Верацэйскага сельсовета, пейкі Бондараў увагнаў каня на паломаны мост, конь разбіўся і паў.

Страхавая інспекцыя фінаддзела накіравала ў раённую пракуратуру 9 актаў для прыцягнення да адказнасці вінаватых у драпежніцкіх адносінах да конскага пагалоўя. Пракурор чамусьці звярнуў назад гэтыя акты, заявіўшы:

— Гэта справы дробнага характару.

Г. АКСЕЛЬРОД.

А. СТЭЦКІ

ПРАПАГАНДА ВЫБАРЧАГА ЗАКОНА

Зараз-жа следам за апублікаваннем «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» на прадпрыемствах і ў калгасах, у совецкіх установах разгарнулася вялікая палітычная работа.

На сваіх сходах, на многатысячных мітынгах рабочыя і сяляне віталі новы выбарчы закон, які з'яўляецца прадаўжэннем Сталінскай Канстытуцыі і падводзіць ушчыльную да выбараў вярхоўнага органа ўлады СССР па новай выбарчай сістэме.

Партыйныя арганізацыі праводзілі і праводзяць чыткі і растлумачэнне выбарчага закона, гутаркі аб законе не толькі сярод рабочых і калгаснікаў, але і сярод хатніх гаспадынь, сярод саматужнікаў, сярод сезонных рабочых.

У сувязі з падрыхтоўкай выбараў у Вярхоўны Совет зноў праводзяцца вялікія мітынгі для рабочых цэлых прадпрыемстваў або раду прадпрыемстваў з удзелам 10—15 і нават 20 тысяч грамадзян.

Цяпер у перадавых прамысловых цэнтрах вывучэнне «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» праводзіцца больш грунтоўна. Партыйцы і комсамольцы вывучаюць «Палажэнне аб выбарах» у партыйных і комсамольскіх гуртках, раздзел за раздзелам, артыкул за артыкулам.

Не адстаюць і беспартыйныя рабочыя. Не толькі рабочы актыў,—шырокія масы рабочых праяўляюць велізарную цікавасць да выбарчага закона, імкненне грунтоўна падрыхтавацца да выбарчай кампаніі, добра ўсвоіць закон, каб поўнасцю ажыццявіць свае празы грамадзян СССР.

На многіх прадпрыемствах у перадавых прамысловых цэнтрах арганізуюцца ў даны момант масавыя гурткі па вывучэнню выбарчага закона. Толькі на адным электракамбінаце імя Куйбышэва ў Маскве ёсць звыш 300 гурткоў па вывучэнню выбарчага закона, ахапляючых некалькі тысяч рабочых. Гэтыя гурткі добра наведваюцца, іх удзельнікі праяўляюць вялікую актыўнасць. Для кіраўніцтва гэтымі гурткамі вылучана 400 чалавек, у асноўнай масе — члены партыі. Рабочыя праяўляюць вялікую цікавасць да пытанняў, якія адносяцца да выбараў у Вярхоўны Совет. Яны ахвотна ідуць на мітынгі, гутаркі і ў гурткі, атрымліваюць адпаведную літаратуру: праз кіёск і парткабінет электразавода распаўсюджана 12 тысяч экземпляраў «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет».

У Ленінградзе на заводзе імя Калініна арганізавана 105 гурткоў, на заводзе імя Марці—131 гурток. У гэтых гуртках займаюцца тысячы рабочых. На аўтазаводзе імя Молатава ў Горкім да 20 жніўня 387 гурткоў наведвала звыш сямі тысяч рабочых. На тэкстыльнай фабрыцы імя Вагжанава (Калінін) арганізавана 148 гурткоў і т. д. У гэтых гуртках вывучэнню выбарчага закона адводзіцца 4—6 заняткаў.

Праўда, далёка не ўсюды гэта работа вядзецца з такім размахам і на такім узроўні, як у Маскве, Ленінградзе, Горкім. Там, дзе прапавалі ворагі народа, дзе яны зрывалі і руйнавалі масавую палітычную работу, дзе партарганізацыі яшчэ не выправілі становішча, гэта важнейшая палітычная работа толькі пачынаецца і яшчэ не арганізавана па-большэвіцку. Так абстаіць справа ў Яраслаўлі, дзе партыйныя арганізацыі толькі прыступілі да растлумачэння выбарчага закона, у Іванаве, дзе палітычная работа толькі пачынае выпраўляцца і дзе яна была вельмі запушчана. Дрэнна абстаіць справа ў Татарскай АССР.

Не заўсёды аддаецца належная ўвага падбору кіраўнікоў. Бываюць выпадкі — гэта адзначаецца ў Іванаўскай вобласці, калі партыйныя камітэты вылучаюць у якасці кіраўнікоў непадрыхтаваных, а часамі і малапісьменных таварышоў, якія толькі блытаюць слухачоў. Супроць гэтага трэба перасцерагчы самым рашучым чынам. Тут шкадней за ўсё простая пагоня за колькасцю, за ахопам, спробы шчагаляць статыстыкай і лічбамі, фармальна ўцягненых у гэтыя гурткі.

Адным з істотных недахопаў у рабоце некаторых гурткоў з'яўляецца фармальнае правядзенне заняткаў. У некаторых гуртках кіраўнік проста зачытвае «Палажэнне аб выбарах», падрад артыкул за артыкулам, не гутарачы з слухачамі аб важнейшых пунктах, не растлумачваючы асобныя незразумелыя для іх пытанні. У іншых гуртках уся ўвага сканцэнтроўваецца на тэхніцы выбараў, вывучэнне «Палажэння аб выбарах» праводзіцца адарвана ад Канстытуцыі.

Нарэшце, некаторыя партарганізацыі не цікавяцца, як кіраўнікі гурткоў адказваюць на пытанні слухачоў, як яны растлумачваюць «Палажэнне аб выбарах». Партком Горкаўскага аўтамабільнага завода імя Молатава, напрыклад, не цікавіцца нават тым, якія адказы на пытанні даюцца мясцовым радыёвузлом, перадачу якога слухаюць усе рабочыя.

А гэта-ж—галоўнае. Пытанняў па выбарчаму закону ўзнікае многа. Не ўсе, напрыклад, да гэтага часу ўсвоілі яшчэ, чаму Вярхоўны Совет падзяляецца на дзве палаты, якое значэнне мае Совет Нацыянальнасцей. Асобныя варожыя элементы прабуюць прадставіць справу такім чынам, што ўлзел грамадзян, скажам, Татарскай рэспублікі ў выбарах дэпутатаў Совета Нацыянальнасцей і ад РСФСР і ад Татарскай АССР ёсць парушэнне прынцыпу роўнага галасавання. Гэта гаворыць аб тым, што неабходна ў патрэбных выпадках умець даваць адпор варожым вылазкам і ў той-жа час правільна і грунтоўна растлумачваць ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку ВКП(б), якая знайшла сваё выражэнне ў новай Канстытуцыі.

Другія таварышы цікавяцца, якія арганізацыі і як будуць выстаўляць кандыдатаў. І тут не заўсёды растлумачэнне адпавядае выбарчаму закону і Канстытуцыі. У артыкуле 141 Канстытуцыі дакладна сказана, што права выстаўляць кандыдатаў забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных і пералічана, за якімі іменна. Не гледзячы на гэта яснае ўказанне, у поўным разрэзе з імі былі апартуністычныя спробы распаўсюдзіць права выстаўляць кандыдатаў і на папоўскія, царкоўныя, сектанцкія арганізацыі, якія працуюць не ў інтарэсах працоўных, а адурачваюць, адурманьваюць працоўных.

Гэтыя асобныя факты гавораць аб тым, што партыйныя арганізацыі павінны ведаць, як вядзецца растлумачальная работа па выбарчаму закону, своечасова выпраўляць памылкі асобных прапагандыстаў і сістэматычна іх інструктаваць.

З паказанымі недахопамі трэба пакончыць. Палітычная работа вакол закона аб выбарах у Вярхоўны Совет мае велізарнае значэнне. Яна не толькі ўзнімае палітычнае сазнанне грамадзян СССР. Яна з'яўляецца непасрэднай падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Совет. Найбольш перадавая частка працоўных ужо цяпер рыхтуецца да таго, каб прымаць актыўны ўдзел у выбарах.

Ствараецца актыў прапагандыстаў і агітатараў, які можна будзе прыцягнуць і для правядзення выбарчай кампаніі. Гэты актыў вырастае з кіраўнікоў масавых гурткоў, з тых партыйных і адданых совецкай уладзе беспартыйных рабочых, якія грунтоўна ўсвоілі Канстытуцыю СССР і «Палажэнне аб выбарах» і могуць ужо цяпер весці работу сярод іншых слаёў насельніцтва па выбарчых участках, у бараках, інтэрнатах і жаўтах.

А для правядзення выбарчай кампаніі нам неабходны вялікія кадры людзей. Патрэбны агітатары і прапагандысты, якія будуць праводзіць сходы і гуткаркі, патрэбны ведаючыя закон людзі, якія змогуць растлумачыць, адказваць на пытанні ў ходзе выбарчай кампаніі, патрэбны вялікія кадры і для ўчастковых выбарчых камісій.

Вось чаму партыйныя арганізацыі павінны звярнуць сур'ёзную ўвагу на гэту работу, а партыйныя камітэты павінны вывучаць і ведаць актыў агітатараў і прапагандыстаў, павінны накіроўваць агітацыю.

Гэту палітычную работу — па прыкладу нашых перадавых абласцей — неабходна паставіць і ў тых прамысловых цэнтрах, дзе яна яшчэ знаходзіцца ў загоне або дзе яе не ўзнялі па вышыню (Іванава, Харкаў, Сталінград).

Асабліва неабходна пралуміць пытанне аб разгортванні гэтай вялікай работы ў вёсцы. Падыходзіць час, калі ўборачныя работы падыходзяць да канца. Калгасны актыў і партыйныя арганізацыі ў вёсцы павінны як след узяцца за растлумачэнне выбарчага закона.

Арганізаваць гэту справу ў вёсцы іменна цяпер вельмі неабходна. Трэба мець на ўвазе, што ў горадзе працоўныя ўжо маюць вопыт масавага закрытага галасавання пры выбарах кіруючых органаў профсаюзных арганізацый. Вёска гэтага вопыту амаль не мае. У горадзе больш грунтоўна пастаўлена вывучэнне выбарчага закона.

Усё гэта вельмі важна яшчэ і таму, што выбарчыя ўчасткі ў вёсцы будуць менш і, значыцца, больш патрабуецца чэсных, праваных людзей для ўчастковых выбарчых камісій.

Горад павінен прысці на дапамогу вёсцы. І тут павінна праявіцца кіруючая роля горада. Неабходна цяпер-жа падрыхтаваць лепшых агітатараў і прапагандыстаў з рабочых, партыйнага і прафесіянальнага актыва для растлумачэння параўку выбараў у Вярхоўны Совет і Канстытуцыі СССР сярод працоўных вёскі. Неабходна цяпер-жа пачаць пасылку гэтых людзей у вёску з тым, каб кожны агітатар на працягу некалькі дзён паязджаў у калгасе, правёў заняткі з калгаснымі актывам і дапамог усвоіць выбарчы закон, дапамог азнаёміць калгаснікаў з параўкам выбараў.

Неабходна таксама, каб партыйныя арганізацыі ўжо цяпер арганізавалі ў хатах-чытальнях гуткаркі і кансультацыі па пытаннях выбараў.

Выбары ў Вярхоўны Совет не за гарамі. Партыйныя арганізацыі павінны ўдзяліць сур'ёзнейшую ўвагу вялікай палітычнай рабоце, якая разгортваецца вакол «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР».

«ПРАВДА».

АЧЫСЦІЦЬ ЛЯСНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АД ВОРАГАЎ

(Агляд пісем)

У канцы ліпеня на сходзе актыва Наркамлеса вельмі шмат гаварылі аб засмечанасці леспрамгасаў, сплаўных кантор, лесгасаў класава-варожымі элементамі. Актыў патрабаваў ад наркома тав. Рыжыкава ў бліжэйшы-ж час ачысціць усю сістэму Наркамлеса ад усіх ворагаў і вызунуць на кіруючую работу новыя маладыя кадры стаханаўцаў, адданых справе людзей.

Прайшоў цэлы месяц, але, як сцвярджаюць сігналы з месц, у Наркамлесе ўсё па старыцы. Класавыя ворагі працаўжаюць актыўна падрываць работу і зрываюць важнейшыя мерапрыемствы партыі і ўрада.

У рэдакцыю паступаюць дзесяткі пісем аб шкодніцкай рабоце ворагаў народу.

Асабліва вялікая засмечанасць у лесгасах. Тут беспакарана арудуюць ворагі.

— Начальнік Бялыніцкага лесгаса Казлоў, — піша нам ляснік, — увесь час п'янствуе, здзекваецца над лепшымі работнікамі. За апошні час ён выжыў з работы 19 лесніковў і акружыў сябе злачыннымі элементамі. На тэрыторыі лесгаса здараюцца частыя пажары. Тут згарэла да 100 га лесу. Казлоў-жа ашуквае кіраўніцтва лесааховы, пасылаючы хлуслівыя весткі.

Група рабочых Клічаўскага лесгаса паведамляе аб засмечанасці Бердоўскага лясніцтва. Ляснічы Казлоўскі Нікалай — актыўны ўдзельнік белапольскай акупацыі, разам з белапалякамі прымаў удзел у нападзе на мястэчка Клічаў. Пасля ўходу акупантаў Казлоўскі прабраўся праз граніцу і ўстроіўся ляснічым.

На гэтай пасадзе ён займаецца рознымі злачынствамі: прадае дзяржаўны лес без усякіх лесарубачных білетаў, знішчажае сасновы маладняк. Казлоўскі прыняў на работу ў якасці аб'ездчыкаў і лясніковў былых бандытаў-балахоўцаў (Карчэўскі, Рыгор, Акуліч Ф., Міхалап Федось, Церашкоў, Апюхоўскі і інш.). Гэтая шайка знішчажае дзяржаўны лес, спекулюе сенажаццю.

— Дырэктар Аршанскага лесгаса Захарэвіч, — піша член саюза, — звязаны з чужым элементам. Працуючы ў Плешчаніцкім раёне, ён растраціў 3 тысячы рублёў. На адказную работу пасадзіў асуджанага за шкодніцтва Дэмчанка. Лесгас прадаў адной арганізацыі Украіны 14 тысяч кубаметраў лесу і атрымаў ад пакупнікоў хабар. Калгасам-жа лесгас адпускае самы дрэнны лес і на далёкай адлегласці. Ляснік Латышоў таксама разбазарвае і спекулюе лесам.

Ворагі стараюцца асабліва прабраца ў пагранічныя раёны. У некаторых выпадках пры блізарукасці і патуранні мясцовых арганізацый ім гэта лёгка ўдаецца.

Селькор з Плешчаніц паведамляе, што ў Каменскім лясніцтве прынялі на пасаду лесніка дэзертыра Чырвонай Арміі, чалавека з цёмным мінулым Вашкевіча Сямёна. Ляснічы Бочкароў яго высунуў аб'ездчыкам.

Кіраўніцтва па лесаахове (начальнік Шынкароў) не толькі не прымае ніякіх захадаў да ачысткі лесгасаў ад варожых элементаў, а наадварот, само насаджае ляснічтвы ворагамі народу.

Такое-ж становішча і ў трэсце Лесбел. Трэст да гэтага часу не прыслухоўваецца да сігналаў з месц.

— Дырэктар Мозырскага леспрамгаса Нікіперовіч, — піша тав. Р., — некалькі разоў знімаўся з работы і выключаўся з партыі за розныя злачынствы. У леспрамгасе ён выжывае з работы малалых спецыялістаў. У лесе гніюць дзесяткі тысяч кубаметраў лесу. Запазычанасць па зарплаце рабочым-лесарубам складае 175 тысяч рублёў. За апошні толькі 1936 год страты складаюць 527 тысяч рублёў. Нікіперовіч быў песна звязан з ворагамі народу і прадстаўляў у іх распаражэнне ў Калінкавіцкай лачы дом леспрамгаса.

У Мозыры-ж працуе старшынёй райкома саюза леса і сплава Зайчык. Ён здзекваецца над членамі саюза. Ад лесніка Дулуба Зайчык атрымаў хабар.

Працуючы начальнікам Слабодскага лесучастка Мозырскага леспрамгаса, Зайчык займаўся раскраданнем дзяржаўных грошай, падрабляў дакументы. Ён быў песна звязан з выкрытымі зараз трацкістамі. Сам ён з'яўляецца сынам буйнага спекулянта, сваё соцыяльнае паходжанне скрыў ад партыі.

Загадчыкам конпай базы, Гаранскага лесаэксплаатацыйнага ўчастка, Полацкага леспрамгаса, працуе былы ўладар фальварка Азолін Іван. Ён займаецца антысавецкай агітацыяй і трымае сувязь з асобамі адной замежнай дзяржавы. На базе ён раскрадае фураж, лепшых рабочых звальняе з работы.

Тав. Майзель з Бабруйска піша, што на Брожскім механізаваным пункце выключна дрэнныя бытавыя ўмовы. Інтэрнаты разбураны, рабочыя спяць на падлозе. Няма ні ложкаў, ні сталоў, ні крэслаў. Сталовая ўжо год... рамантуецца. 400 рабочых астаюцца без гарачага харчавання. Начальнік пункта Навіцкі не хоча прыслухоўвацца да скарг рабочых. Не дзіва, што замест 5 брыгад на работу выходзіць адна-дзве. Трактары робяць адзінва рэйсы замест трох-чатырох. За 15 дзён жніўня план вывазкі выканан на 50 проц.

Не ўсё добра і ў сплаўных арганізацыях. Тав. В. з Чэрвеня паведамляе аб тым, што план сплаву ў 62 тысячы кубаметраў сарван. Начальнік участка Нісневіч даў хлуслівыя весткі ў Камісію совецкага кантроля. Многа каштоўнай драўніны і дроў патанула ў рэчны Волма. Вывезены да прыстані лес не сплаўляецца. Зайчык з'яўляецца сам сынам буйнага гандляра, выключан з партыі, як чужы элемент.

Прыведзеныя факты яшчэ раз пацвярджаюць, што ў Наркамлесе БССР ўпарта не выконваюць рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанні актыва, не ачышчаюць лясныя арганізацыі ад ворагаў.

СПРАВЫ АДНАГО ПАРТКОМА

З тых пор як быў выбран партком мозырскага лесазавода «Пролетарый» прайшло ўжо каля 5 месяцаў. Перыяд досыць вялікі, але партком у частцы перабудовы партыйна-масавай работы зрабіў вельмі мала. Сакратар парткома т. Веслаўжыў чыстасардэчна прызнаецца:

— Справы ў нас у новым парткоме ў параўнанні з старым амаль не змяніліся.

Калі нават прыняць пад увагу скромнасць сакратара, які не любіць асабліва хваліцца дасягненнямі, то і ў гэтым выпадку ацэнка становішча справаў не зменіцца. Новым у рабоце парткома можна лічыць тое, што ён зрабіў першыя крокі ў набліжэнні сваёй работы да мас. Калі раней непасрэдна ў цэхах ніякай партыйна-масавай работы не было, то зараз партком праз сваіх агітатараў праводзіць у цэхах палітычныя гутаркі і чыткі газет. У механічным цэху, напрыклад, агітатар тав. Бердзічэўскі часта праводзіць з рабочымі гутаркі аб новым выбарчым законе, падзеях у Іспаніі, Кітаі і аб іншым. Сярод рабочых, якія працуюць на беразе ракі на падачы лесаматэрыялаў у лесапільны цэх, палітычныя гутаркі праводзіць агітатар Дубатоўка.

Аднак, трэба сказаць, што гэта форма палітычна-масавай работы ўжываецца ва ўсіх цэхах. У дрэваапрацоўчым і лесапільным цэхах, напрыклад, за ўвесь час яшчэ ніхто не правёў з рабочымі ні адной гуткі на палітычныя тэмы. І толькі таму, што партком фармальна аднёсся да выдзялення ў гэтыя цэхі палітагітатараў. Гэта адказная справа даручана палітычна-малапісьменным таварышам, якія пры ўсім сваім жаданні не могуць праводзіць талковыя гутаркі з рабочымі.

Наогул трэба адзначыць няправільную думку парткома, які лічыць, што праводзіць палітагітацыю ў цэхах павінны толькі комуністы, працуючыя там. Адгэтуль не выпадкова, што члены парткома тт. Мемех (дырэктар завода) і Смаль (старшыня заўкома) палітычнай агітацыі сярод рабочых зусім не праводзяць.

Буйным прабелам у палітычнай агітацыі на заводзе з'яўляецца адсутнасць такой масавай формы работы, як палітзвень. Рабочых цікавяць многія пытанні, звязаныя з падзеямі ў Іспаніі, Кітаі і інш. краінах, а таксама з выбарамі ў Вярхоўны Совет. Аднак, партком ніяк не збярэцца правесці па гэтых важнейшых пытаннях схода рабочых з пастаноўкай на ім глыбокага палітычнага даклада.

Партыйная прапаганда на заводзе таксама закінута. Партшколы і гуркі існуюць па сутнасці фармальна. Узяць, напрыклад, гурток па вывучэнню гісторыі партыі. Ён арганізаван яшчэ ў 1935 годзе, але праграмы далёка не закончыў. У 1935 годзе слухачы дайшлі да Кастрычніка 1917 года, а ў мінулым годзе пачалі зноў спачатку. Сёлета гурток паспеў распрацаваць толькі дзве тэмы паслякастрычніцкага перыяда.

Прычына такой марудлівасці ў вывучэнні комуністамі гісторыі партыі заключаецца ў тым, што большасць праграмных дзён работы гуртка загружаецца бягучымі пытаннямі. Віна ў гэтым не столькі парткома, колькі культпропа райкома партыі, які ўвёў у сістэму гэту практыку.

Кандыдацкая школа таксама працуе з рук вон дрэнна. Яна па сутнасці не школа, а палітгурток бягучай палітыкі. Яшчэ не было ні адных заняткаў, якія-б праходзілі па праграме. Тое-ж самае трэба сказаць і аб палітгуртку спачуваючых. Гэты гурток збіраецца ад выпадку да выпадку, прычым паведвае заняткі ўсяго на ўсяго палова спачуваючых.

Гаворачы аб спачуваючых, трэба адзначыць, што партком з імі наогул ніякай работы не праводзіць. Сакратар парткома амаль ніколі не збірае іх і ні аб чым з імі не гутарыць. Партыйныя даручэнні большасці спачуваючых таксама не даюцца. Таму не дзіва, што ні адной заявы аб прыёме ў кандыдаты партыі ад спачуваючых не паступіла. Між тым сярод іх ёсць нядрэнныя беспартыйныя большэвікі, праявіўшыя сябе на вытворчасці. Узяць, напрыклад, вядомага рамшчыка-стаханаўца т. Пілясава, які адным з першых паказаў на заводзе ўзоры стаханаўскай работы. Па ўсіх другіх даных, т. Пілясаў таксама дастоен быць у радах комуністычнай партыі. Аднак, ніхто з парткома на гэту тэму з т. Пілясавым не гутарыў.

Партком наогул не вялзе ніякай работы па ўцягненню ў партыю лепшых людзей вытворчасці. Нават сярод комсамольцаў няма адпаведнай работы. Між тым, у комсамольскай арганізацыі завода ёсць таварышы, якіх можна прыняць у партыю без усякага сумнення. Аб радзе комсамольцаў усе члены парткома даюць самыя лепшыя водзывы, але калі пытаеш у іх, чаму-ж яны не ў партыі, члены парткома толькі папіскаюць плячыма.

У партыйнай арганізацыі завода ёсць нямала кандыдатаў з вялікім стажам. Некаторыя з іх зусім падрыхтаваны да пераводу ў члены партыі. Аднак, з імі на гэту тэму таксама ніхто ніколі нічога не гаварыў, і яны прадаўжаюць аставацца ў кандыдатах.

Нельга не адзначыць і таго, што партком зусім не займаецца пытаннем вылучэння маладых кадраў на адказныя пасты. За ўвесь час ні аднаго радавога рабочага ўнутры завода не вылучана. Ужо доўгі час склад піламатэрыялаў без загадчыка, а партком ніяк не асмеліцца вылучыць на гэту пасаду аднаго з стаханаўцаў, хоць-бы таго-ж самага т. Пілясава, які поўнасцю можа справіцца з гэтай работай.

Так працуе партком адной з буйных пярвічных арганізацый Мозыра. Ці адказвае за такое становішча партыйна-масавай работы райком партыі. Безумоўна. Сакратар райкома т. Левін асабіста праводзіў справаздачна-выбарчы сход на заводзе «Пролетарый». Ён добра ведаў усе недахопы работы старога парткома і тыя мерапрыемствы, якія былі намечаны для паляпшэння работы. Аднак, правёўшы партыйны сход т. Левін ні разу не пацікавіўся, як новы партком ажыццяўляе намечаныя мерапрыемствы. Не патрабаваў ён гэтага і ад інструктара райкома т. Трэйсцера, які павінен быў аказаць парткому дапамогу ў наладжанні партыйнай работы.

Р. ФРАЛОЎ.

ЗАМЕСТ АГЛЯДУ ДРУКУ

КАМУ ПАТУРАЕ ГАЗЕТА І КАГО ПРЫКРЫВАЕ ЯЕ РЭДАКТАР

«(КАЛГАСНАЯ ПРАЎДА»—орган Лепельскага акругкома, райкома КП(б)Б і акрвыканкома)

Пасля лепельскага працэса ў сакавіку месяцы г. г. рэдактар акруговай газеты «Калгасная праўда» тав. Перкоўскі, нібы празрэўшы, заявіў:

«Вывады з гэтага працэса трэба зрабіць кожнаму кіраўніку...».

Але, праглядаючы ўсю мінулую і наступную дзейнасць рэдакцыі газеты «Калгасная праўда», не цяжка здагадацца, што гэта было сказана толькі для краснага слаўца.

Суловы прапэс перад усімі працоўнымі раскрыў, што жудасныя скажэнні рэвалюцыйнай законнасці ў Лепелі былі актам варожых спраў. Пазіцыя «Калгаснай праўды» ў сувязі з так званай лепельскай справай выглядае вельмі дрэнна. Газета не толькі не здолела выкрыць па шматлікіх сігналах працоўных абураючае беззаконне ў акрузе, але пакрывала яго.

Пасля прапэсу ў Лепелі не спынілася шкодніцтва. Справу выкрытых шкоднікаў прадаўжалі іншыя. На чале камісіі па «ліквідацыі» вынікаў шкодніцтва быў пастаўлен польскі шпіён, які арудваў у акруговым выканаўчым камітэце.

Усяляк тармазіўся зварот незаконна адабранай ад алнаасобнікаў маемасці. Справы гэтыя старанна хаваліся. У рэдакцыю пачалі паступаць сігналы. Але газета аставалася вернай свайму прынцыпу — неўмяшання ў гэтыя справы.

Пасля арышту гэтага шпіёна былі выяўлены схаваныя ў акрвыканкоме 77 спраў аб незаконна адабранай у алнаасобнікаў маемасці і належачай звароту ім. «Калгасная праўда» і пасля гэтага не рашылася выкрыць канкрэтных віноўнікаў, якія прымалі ўдзел у хаванні спраў, замаўчала выяўлены факт.

Замест бязлітаснага і рашучага выкрыцця польскіх шпіёнаў і стаўленікаў, рэдактар газеты тав. Перкоўскі расхвальваў апошніх і палхалімічаў да іх.

— Калі я аб вас сёе-тое пішу, то гэта не значыць, што я вас не паважаю, або лічу дрэнным работнікам — так, з ухмылкай на твары, гаварыў Пяркоўскі на акруговай партыйнай канферэнцыі таму-ж самаму шпіёну, які ўзначальваў указаную вышэй камісію.

Не без удзелу Пяркоўскага сабутыльнікі і хаўруснікі прапягнулі гэтага шпіка ў склад членаў пленума і бюро акруговага камітэта КП(б)Б.

Самазававолены рэдактар назаўтра-ж пасля выбараў у перадавым артыкуле старанна выслаўляе гэту пазэю, як большэвікі ўчынак і зноў лісліва расхвальвае шпіёна:

«Здольных-жа таварышоў, хоць і дапусціўшых памылкі ў рабоце, большэвікі ўмеюць ацэньваць і берагчы».

Дарэчы, ці не з-за бярэжлівасці, якую праяўляе Пяркоўскі да шпіёнаў на старонках «Калгаснай праўды» ад 1 верасня, змешчана клішэ, дзе сярод групы знятых можна знайсці выкрытых органамі НКВД шпіёнаў.

Парушэнні рэвалюцыйнай законнасці ў Лепелі не спыніліся нават і пасля працэса. Аб іх ведала «Калгасная праўда» і патурала злачынцам. Так, напрыклад, рэдакцыя ведала аб тым, што з ведама начальніка лепельскай акруговай міліцыі тав. Дружыніна ў грамадзянкі вёскі Мацюшына, Стайскага сельсавета, Бабровіч Марыі пад відам спагнання штрафа былі адабраны апошнія драўляныя сенцы.

Сенцы разабраны і праданы. Канкрэтныя віноўнікі гэтага злачынства не панеслі ніякага пакарання і да апошняга часу. Рэдакцыя ведае аб гэтым і маўчыць.

З ведама таго-ж Дружыніна быў аштрафаван, выходзячы з чыста фармальных меркаванняў, 78-гадовы старык Курац Іван, член калгаса «Ляхавічы», таго-ж сельсавета. Аднак, і пасля гэтага факта «Калгасная праўда» не адважылася выступіць з матэрыялямі аб павозінах Дружыніна, паставіць аб ім пытанне.

Усё калгаснае сялянства ўзнялося на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, асабліва пасля рашэння СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 2 жніўня. Але газета і тут асталася вернай сабе.

Газеце не маглі быць невядомымі факты яўнага ігнаравання пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) у Бягомльскім раёне. Сакратар райкома КП(б)Б Дэйч сарваў выкананне гэтай важнейшай пастановы ў вызначаныя тэрміны. За Дэйчам лічыўся рад антыпартыйных паводзін. Яшчэ 29 чэрвеня «Звязда» сігналізавала аб тым, што Дэйч прыкрывае трацкістаў і шкоднікаў. Нават пасля гэтага сігнала «Калгасная праўда» старанна выгараджвала Дэйча і ўтойвала яго ўчынкі.

Характэрным у гэтых адносінах з'яўляецца выступленне «Калгаснай праўды» 8 ліпеня г. г. з «грамавым» артыкулам аб Плешчаніцкай МТС, пад загалоўкам: «У палоне палітычнай бясклопатнасці». Тут «выкрываюцца» ўжо выкрытыя ворагі. Хапя рэдакцыя мела факты аб патуранні гэтым ворагам з боку Дэйча, але ўмаўчала аб іх.

Маўчала газета і аб зрыве выканання ў вызначаныя тэрміны пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) у Чашніцкім і Ушацкім раёнах. Наадварот, рэдакцыя змясціла на сваіх старонках очкаўпірацельскія рапарты сакратароў гэтых райкомаў КП(б)Б тт. Марголіна і Волкава.

Нічога не робіць газета, каб дапамагчы партыі хутчэй ачысціць апарат акруговых і раённых партыйных, совецкіх, зямельных і іншых арганізацый, выкарчаваць алтуль яшчэ не выкрытых польскіх шпіёнаў і іх стаўленікаў.

Хіба не ясна пасля ўсяго сказанага каму патурае газета і каго прыкрывае яе рэдактар!

ПРЫЗЫЎНІКІ-ЗНАЧКІСТЫ

У гэтым годзе сярод прызыўнікоў Касцюковіцкага і Хоцімскага раёнаў поўнасцю ліквідавана непісьменнасць. Каля 400 прызыўнікоў здалі нормы на значкі варашылаўскага стралка, «ГПА» і «ШПХА».

Прызыўнікі 22 сельсоветаў дружна падпісаліся на пазыку ўмацавання абароны СССР. Найбольш актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі прынялі прызыўнікі Завацкі Іван, Дубаневіч, Самуілік, Кірпічэнка Пімен, Бодрыкаў і інш. Тав. Дубаневіч падпісаўся на пазыку на 475 руб., тав. Завацкі — на 300 руб. і т. д.

Т. КОМАР.

Падрыхтоўка клубаў да зімы

ГОМЕЛЬ. Па Беларускай чыгунцы разгарнулася работа па падрыхтоўцы клубаў да зімы. Для бягучага рамонту клубаў Дорпрофсожам адпушчана 93 тысячы рублёў.

У асобных клубах арганізуюцца новыя гурткі самадзейнасці.

Ва ўсіх адзяленнях праводзяцца зараз нарады культармейцаў, абмяркоўваюцца планы работы гурткоў, бібліятэк-чытальняў і тэхнічных кабінетаў.

ЯШЧЭ НЕ ЛІКВІДАВАНЫ ВЫНІКІ ШКОДНІЦТВА

Доўгі час на будаўніцтве Аршанскага ільнокамбіната арудвалі ворагі народу. Нядаўна выкрыты шкоднікі і арыштаваны. Аднак і зараз ліквідацыяй вынікаў шкодніцтва ніхто не займаецца. Тэхніка безапаснасці тут адсутнічае. Маюць месца няшчасныя выпадкі.

У новых дамах, дзе жывуць усяго толькі тры месяцы, ужо завяліся клапы. У пакоях павыбіты вокны і застаўлены фанерай. Увечары тут няма святла. Камендатура ніякіх мер не прымае, каб прывесці кватэры ў парадак.

Абеды ў сталовай дарагія і нясмачныя. Загалчык Жук толькі алгаварваецца жартамі. Часта падаюць суп з тараканамі.

У сталярнай майстэрні вялікі беспарадак. Амаль-што ўсе варштаты сапсаваныя і рабочыя баяцца на іх працаваць. Каля варштатаў няма агарожы, часта рвуцца пасы. Загалчык майстэрні Новікаў ніякіх захадаў не прымае да стварэння ўмоў рабочым. На сігналы рабочых кіраўніцтва камбіната зусім не рэагуе.

Б. П.

ПАДРУЧНІКІ ПА ГІСТОРЫІ СССР НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У Дзяржаўным выдавецтве БССР закончан пераклад на беларускую мову падручніка «Кароткі курс гісторыі СССР» пад рэдакцыяй праф. Шастакова для трэцяга і чацвертага класаў. Падручнік будзе выдан тыражом у 500 тысяч экземпляраў. Частка тыража павінна выйсці з друку ў пачатку кастрычніка.

На дэманстрацыі, прысвечанай XXIII Міжнароднаму юнацкаму дню, у Менску.
Фото С. Грына і Я. Салавейчыка.

Разгром карнілаўскага мяцежу

(7—12 верасня 1917 года)

У ліпеньскія дні 1917 г. контррэволюцыя нанесла паражэнне пролетарыяту і ўстанавіла ваенную дыктатуру. Здрадніцкая тактыка згодніцкіх у ліпеньскія дні развязала сілы контррэволюцыі. Буржуазія разграміла дэманстрацыю рабочых у Петраградзе, загнала ў падполле партыю большэвікоў.

Пролетарыят у ліпеньскія дні папярпеў паражэнне, але не быў разбіт. Партыя большэвікоў не дала яго справакаваць, яна вывела масы з-пад удараў буржуазіі. Арганізаванае адступленне згуртавала пролетарыят.

Буржуазія рукамі меншавікоў і эсэраў атрымала перамогу, але гэта была пірава перамога. Меншавікі і эсэры ў ліпеньскія дні канчаткова выкрылі сябе, як здрадзнікі і каты рэволюцыі. Масы адвярнуліся ад іх. Масы патрабавалі міру. Салдаты адмаўляліся ваяваць. Але вайна прадаўжалася. Сяляне патрабавалі зямлю. Часовы ўрад падаўляў рух сялян ваеннай сілай. Масы патрабавалі хлеба. Але капіталісты закрывалі прадпрыемствы, выкідаючы рабочых на вуліцу. Эканамічная разруха ў краіне ўсё павялічвалася. Масы пачыналі разумець, што без звяржэння Часовага ўрада ні адно з карэнных пытанняў рэволюцыі не можа быць вырашана.

Не было такой сілы, якая магла-б спыніць нарастанне руху рэволюцыйных мас. Контррэволюцыя адкрыта загаварыла аб неабходнасці хуткага разгрому рэволюцыі. Пачалася падрыхтоўка да перавароту. У якасці галоўнай зброі сваёй барацьбы за ўладу буржуазія рыхтавала армію. Каб гэта зброя была паслухмянай у яе руках яна паставіла на камандныя высоты сваіх людзей.

18 ліпеня вярхоўным галоўнакамандуючым быў назначан генерал Карнілаў, які ўвёў на фронце кару смерцю і расстрэльваў зайсковыя часці, якія адмаўляліся ісці ў наступленне. Буржуазны друк апяваў Карнілава. Ён ствараў яму славу героя, хоць яму было добра вядома, што за «герой» гэты Карнілаў. Камандуючы арміяй, ён у часе вайны не здолеў арганізаваць адступленне сваіх палкоў. Ён загёў сваю дывізію ў пастку, а сам разам са штабам пакінуў дывізію. Буржуазія ведала гэта, але яе задавальнялі іншыя якасці Карнілава — яго контррэволюцыйныя «заслугі» ў барацьбе супроць рабочых дэманстрацый і, ідучы на разгром рэволюцыі, яна выбрала Карнілава сваім правадыром. Калёты дзейнічалі ў кантакце з імперыялістамі Антанты, падтрымліваўшымі мяцеж. Карнілава прарочылі ў ваенныя дыктатары. Вакол Карнілава збіраліся ўсе цёмныя сілы контррэволюцыі. Банкі забяспечвалі яго грашыма. Часовы ўрад садзейнічаў арганізацыі контррэволюцыі.

3 жніўня ў Маскве сабраўся гандлёва-прамысловы з'езд, а 12 жніўня — дзяржаўная нарада, скліканая меншавікамі і эсэрамі, — фактычны штаб контррэволюцыі. Склад нарады вызначыў яе сутнасць. На нарадзе сабраліся генералы, вярхушка каманднага састава, кадэцкія прафесары, архірэі, чыноўнікі, прадстаўнікі буржуазіі на чале з Рабушынскім, тым самым Рабушынскім, які пагражаў народным масам голадам і нішчатой. Большэвікі на нараду не былі дапушчаны.

На гэтай нарадзе карнілаўцы разгарнулі сваю праграму разгрому рэволюцыі, і яна была прынята Часовым уралам. Кадэты хапелі прыўрочыць контррэволюцыйны пераварот да нарады.

Але па закліку партыі большэвікоў у Маскве ў дзень адкрыцця нарады забаставала 400 тысяч рабочых. Спыніліся фабрыкі і заводы, замёр рух у горадзе. Контррэволюцыя дрогнула, яна вымушана была адступіць. Зацея перавароту на гэты раз сарвалася. Але рэакцыя не адмовілася ад сваіх планаў. Яна прадаўжала рыхтаваць разгром рэволюцыі.

«Усюды ствараліся тайныя таварыствы, куды ўцягваліся ў першую чаргу афіцэрства і юнкерскія кадры ваенных вучылішч. Сталіца кішэла тайнымі саюзамі, гатовымі падтрымаць контррэволюцыю знутры, як толькі да горада падыйдзе ўзброеная сіла». («История гражд. войны в СССР», стар. 328).

Каб забяспечыць сваю дапамогу, Карнілаў не спыніўся перад здрадай радзіме— ён аддаў немцам Рыгу і адкрыў ворагу подступ да Петраграда. Віну за здачу Рыгі яны хацелі ўзваліць на большэвікоў. Буржуазія рабіла шмат спроб справакаваць пролетарыят на выступленне, каб тым лягчэй яго разграміць. А ў сувязі з «магчымым ускладненнем» сталіца была наводнена афіцэрамі і казакамі. Да Петраграда рушылі карнілаўскія войскі, III конны корпус, куды ўваходзіла «дзікая дывізія», 1 каўказскі конны корпус. Уся падрыхтоўка перавароту праходзіла з ведама Часовага ўрада і Керэнскага. Карнілаў, Каледзін. Радзянка рыхтаваліся патапіць рэволюцыю ў крыві пролетарыята. Керэнскі ўсімі сіламі памагаў Карнілаву вызваліць Петраград ад рэволюцыйных палкоў. Генералу Крымаву, камандуючаму трэцім казацкім палком, было прапанавана рушыць хутчэй на Петраград, абязброіць часці петраградскага гарнізона, разагнаць советы, раззброіць рэволюцыйных кранштадцаў.

Большэвікі паднялі масы на абарону рэволюцыі. Яны ўзначалілі барацьбу мас з контррэволюцыяй.

Керэнскі спалохаўся мас. Ён зразумеў, што выступленне Карнілава ўзніме масы супроць контррэволюцыі і яны заадно змятуць і яго. Керэнскі рашыў змяніраваць і «прыняць меры» супроць мяцежнікаў.

Падтрыманы Усерасійскім Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам Совецкіх. Керэнскі прабаваў арганізаваць абарону Петраграда. Але адзіныя людзі, якія маглі гэта зрабіць, былі большэвікі. Большэвікі арганізавалі абарону сталіцы. Насустрач карнілаўскім войскам рушыла грозная сіла рэволюцыі.

«Усюды пачалася арганізацыя рабочых дружын. У радзе месц былі створаны рэволюцыйныя камітэты...

Супроць карнілаўцаў былі кінуты атрады большэвіцкай чырвонай гвардыі, пад Петраградам рыліся акопы і будаваліся загароды. Спешна здабывалася зброя, фарміраваліся атрады, друкаваліся мільёны лістовак...

Сярод карнілаўскіх войск пачалася агітацыя. Чыгуначнікі разбіралі шляхі і ўсяляк затрымлівалі прасоўванне карнілаўскіх эшалонаў на Петраград» («История гражд. войны в СССР» стар. 344).

Па ініцыятыве С. М. Кірава ў «дзікую дывізію» былі пасланы дэлегаты-мусульмане, якія растлумачылі горцам-салдатам контррэволюцыйную сутнасць карнілаўскай авантуры. У рэзультаце «дзікая дывізія» заявіла начальству, што яна не пойдзе на разгром чырвонай сталіцы.

У гарадах ствараліся рэволюцыйныя штабы барацьбы з контррэволюцыяй. Цэнтральны Камітэт Партыі большэвікоў заклікаў рабочых і салдат усёй краіны да актыўнага ўзброенага адпору контррэволюцыі. Масы адклікнуліся за заклік партыі. Петраградскі гарнізон выгнаў эсэра-меншавіцкіх камісараў і зылучыў на іх месца большэвікоў.

Рашучы адпор мас унёс разлажэнне ў войскі контррэволюцыі. Казакі сталі арыштоўваць сваіх камандзіраў. Па распараджэнню армейскіх камітэтаў у стаўцы былі арыштаваны генералы, падтрымліваўшыя Карнілава.

Ленін, аналізуючы падзеі, пісаў: «Карнілаўскае паўстанне прадстаўляла з сябе падтрыманую памешчыкамі і капіталістамі, з партыяй к.-д. на чале, ваенную змову, якая прывяла ўжо да фактычнага пачатку грамадзянскай вайны з боку буржуазіі» (том XXI, стар. 201).

Але ў той час, як «пачатак грамадзянскай вайны з боку пролетарыята выявіў сілу, свядомасць, грунтоўнасць, рост і ўстойлівасць руху. Пачатак грамадзянскай вайны з боку буржуазіі ніякай сілы, ніякай свядомасці мас, ніякай грунтоўнасці, ніякіх шансаў на перамогу не выявіў». (Ленін, том XXI, стар. 205).

Пад кіраўніцтвам большэвікоў масы атрымалі перамогу над Карнілавым. Карнілаўшчына праваліласа. 30 жніўня Карнілаў быў аддан пад суд. Памешчыкам і буржуазіі не ўдалося разграміць рэволюцыю. Грамадзянская вайна, пачатая генераламі, змяніла ў корані суадносіны сіл.

«Гістарычнае значэнне паўстання Карнілава, — пісаў Ленін, — састаіць іменна ў тым, што яно з надзвычайнай сілай адкрыла масам народа вочы на тую ісціну, якая была прыкрыта і прыкрываецца да гэтага часу згодніцкай фразай эсэраў і меншавікоў, іменна: памешчыкі і буржуазія з партыяй к.-д. на чале і генералы і афіцэры, якія стаяць на іх баку, сарганізаваліся, яны гатовы зрабіць і робяць самыя нечуваныя злачынствы, аддаць Рыгу (а затым і Петраград) немцам, адкрыць ім фронт, аддаць пад расстрэл большэвіцкія палкі, пачаць мяцеж, павесці на сталіцу войскі з «дзікай дывізіяй» на чале і т. д. — усё гэта дзеля таго, каб захапіць усю ўладу ў рукі буржуазіі, каб умацаваць улаву памешчыкаў у вёсцы, каб заліць краіну кроўю рабочых і сялян.

Паўстанне Карнілава даказала для Расіі тое, што для ўсіх краін даказала ўся гісторыя, іменна, што буржуазія прадасць радзіму і пойдзе на ўсе злачынствы, толькі-б адстаяць сваю ўладу над народам і свае даходы». (Ленін, том XXI, стар. 138—139).

Калі пасля ліпеньскіх дзён дыктатура буржуазіі яшчэ скрывалася за шырмай «урада выратавання рэволюцыі», то ў карнілаўскія дні яна прадстала ва ўсёй сваёй непрыглядной аголенасці. Мільённыя масы згуртаваліся, умацаваліся ў барацьбе з контррэволюцыяй.

Советы ў агні барацьбы ачысціліся ад меншавіцка-эсэраўскай погані. Яны сталі органамі рэволюцыйнага паўстання, і партыя большэвікоў зноў высунула зняты часова пасля ліпеньскіх дзён лозунг: «Уся ўлада советам».

«Цяпер гэты лозунг азначаў прамы падыход рэволюцыі да дыктатуры пролетарыята шляхам паўстання. Больш таго, цяпер гэты лозунг азначаў арганізацыю і дзяржаўнае афармленне дыктатуры пролетарыята». (Сталін, «Вопросы ленинизма», стар. 94).

Масы рыхтаваліся да рашучага бою.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

Як паведамляе іспанскае міністэрства абароны ад 6 верасня, у Бельчытэ (на паўднёвы ўсход ад Сарагосы) вечарам 5 верасня здалася апошняя група мяцежнікаў, засеўшая ў паркве. Рэспубліканцы змагаліся з выключнай адвагай, не гледзячы на ярасную бамбардыроўку фашысцкай авіяцыі, зрабіўшай 32 налёты. Рэспубліканцамі захвачана 4 гарматы, шмат вінтовак і іншага ваеннага снаражання германскай вытворчасці, а таксама прапівагазы італьянскай маркі. Бельчытэ цяпер цалкам у руках рэспубліканцаў, якія прадаўжаюць наступленне ў гэтым раёне.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

У прыбяражнай паласе ў результаце моцнага націску непрыяцеля рэспубліканцы былі вымушаны адступіць у напрамку на Баро.

5 верасня баі праходзілі ў Сіера Мореда, дзе рэспубліканцы адбілі рад атак мяцежнікаў; другая атака непрыяцеля была адбіта рэспубліканцамі ў раёне Эрміда. У канцы дня, у рэзультаце інтэнсіўнай бамбардыроўкі непрыяцельскай авіяцыі, падтрымліваўшай дзеянні пяхоты, рэспубліканцы вымушаны былі некалькі адступіць.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У ноч на 6 верасня рэспубліканскія батарэі 7 гадзін бамбардыравалі непрыяцельскія пазіцыі ў раёне Серо дэ Агіла (высоты, якія пануюць над Універсітэцкім гарадком), дзе мяцежнікі прабавалі ўстанавіць сувязь з войскамі, якія знаходзяцца ля Французскага маста.

Рад умацаванняў мяцежнікаў разбуран.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Мяцежнікі прадпрынялі даве паслядоўныя атакі на Серо дэ Мульва. Абедзве атакі былі адбіты рэспубліканцамі.

* * *

У ноч на 5 верасня два фашысцкія гідрасамалёты бамбардыравалі Тарагону (Каталонія). Афяр няма.



На дэманстрацыі, прысвечанай XXIII Міжнароднаму юнацкаму дню, у Менску.
Фото С. Грына і Я. Салавейчыка.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

ЯРАСНЫЯ БАІ Ў ШАНХАЙСКІМ РАЁНЕ

ШАНХАЙ, 7 верасня. (БЕЛТА). Згодна вестак кітайскага штаба, 5 верасня японскія ваенныя судны і авіяцыя ярасна бамбардыравалі горад Баошань (на паўночны захад ад Шанхая). Кітайскія войскі пакінулі Баошань і чыгуначную станцыю, якая знаходзіцца за сценамі горада. Агенцтва Сентрал Ньюс паведамляе пра бой, які прадаўжаецца ўжо два дні ў гэтым раёне. 5 верасня вечарам да месца баёў падышла новая кітайская дывізія.



У раёне Лодзяньь — упартыя баі. Да апошняга моманту — перавага на баку кітайскіх войск. Вялікі налёт зрабіла японская авіяцыя ў раёне Цзянваня (на поўнач ад Шанхая), дзе каля кітайскага муніцыпалітэта было скінута шмат бомб.

Сур'ёзныя баі адбываліся ва ўсходняй частцы Янцзыпу каля шанхайскага універсітэта, дзе японскія войскі прабуюць прабіцца на злучэнне з японскім дэсантам у Чанхуабане.

* * *

ТОКІО, 6 верасня. (БЕЛТА). Японскія газеты апублікавалі паведамленне, якое сцвярджае, што ў рэзультаце доўгіх баёў японскія войскі 5 верасня занялі Баошань (на паўнач ад Усуна). Наступленне на Баошань вялося адначасова з поўначы і поўдня.

6 верасня часці японскага армейскага і морскага дэсанта пры падтрыманні артылерыі і авіяцыі пачалі буйнейшае з пачатку ваенных дзеянняў наступленне ва ўсходнім сектары міжнароднага сетльмента. У той-жа дзень японскія войскі дасягнулі рэчкі Кайпінцзянь, на поўнач ад шанхайскага універсітэта.

ЯПОНСКІЯ ВОЙСКІ ПРАНІКЛІ Ў ПРАВІНЦЫЮ ШАНЬСІ

ТОКІО, 6 верасня. (БЕЛТА). Агенцтва Домей Цусін сцвярджае, што вялікія сілы японскіх войск перайшлі граніцу паміж правінцыямі Чахар і Шаньсі і 6 верасня занялі Тунтэньчэнь (у правінцыі Шаньсі, за 70 клм. на паўднёвы захад ад Калгана).

Паводле слоў Домей Цусін, японскія войскі, якія аперуюць у раёне Цяньцзінь-Пукоўскай чыгункі, 6 верасня пры падтрыманні артылерыі і авіяцыі пачалі наступленне на першую лінію кітайскіх пазіцый каля Мачана (на поўдзень ад Цзінхая). Адначасова агенцтва паведамляе аб дзеяннях буйнага атрада кітайскіх войск у тылу японскіх пазіцый у раёне Мачана. 5 верасня гэты атрад пачаў моцнае наступленне на японскія пазіцыі каля станцыі Таньгуаньтунь.

З'ЕЗД ФАШЫСЦКІХ ШПІЁНАЎ

БЕРЛІН, 7 верасня. (БЕЛТА). Штутгартскі з'езд заграніччных арганізацый германскай нацыянал-сацыялістскай партыі 5 верасня закончыўся вялікай прамовай Гебельса. У сваёй прамове Гебельс абрушыўся на замежны, у прыватнасці англійскі, друк, які, паводле слоў прамоўцы, не мае ніякага права «размаўляць аб германскіх унутраных справах у тоне самаўпэўненай гувернанткі». Асабліва рэзка Гебельс выступіў супроць тых, хто гаворыць аб адсутнасці якой-небудзь крыўды і свабоды думак у Германіі. Гебельс падкрэсліў, што «ў фашысцкай Германіі крытыка наогул недапушчальна».

З прычыны рэзка адмоўных адносін замежных колаў да меўшага быць назначэння «культурных аташэ» за граніцай, надзеленых правамі дыпламатычных прадстаўнікоў, германскія фашысты, відаць, вымушаны адмовіцца ад гэтага намеру. Гебельс у сваёй прамове заявіў, што няма ніякай неабходнасці ў пасылцы спецыяльных аташэ, бо «кожны германскі фашыст за граніцай сам па сабе з'яўляецца культурным аташэ».

БЕРЛІН, 7 верасня. (БЕЛТА). З прыбыцием Гітлера сёння ў Нюрэнберзе пачаліся ваенныя відовішчы, парады і шэствія. Горад і ваколіцы напамінаюць велізарны ваенны лагер. Над горадам кружацца некалькі сот ваенных самалётаў.

У Нюрэнберг прыбыла сустрэтая вельмі ўрачыста італьянская далегацыя ў складзе прадстаўнікоў фашысцкай партыі, урада і сената.

МІЖНАРОДНЫ ЮНАЦКІ ДЗЕНЬ ЗА РУБЯЖОМ

ПРАГА, 7 верасня (БЕЛТА). У Міжнародны юнацкі дзень 6 верасня па ўсёй Чэхаславакіі адбыліся масавыя мітынгі, сходы і дэманстрацыі, у якіх прымала ўдзел звыш 100 тыс. моладзі. Дэманстрацыі праходзілі пад лозунгамі барацьбы супроць фашыстаў і за адзіны народны фронт. Ва ўсіх гарадах і вёсках Чэхіі, Маравіі, Славакіі, Закарпацкай Украіны і Судэтанямецкай вобласці рабочая і сялянская моладзь дэманстравалі гатоўнасць да баёў супроць фашызма, да барацьбы за паляпшэнне жыцця. Асабліва магутныя дэманстрацыі былі ў Празе, Брно, Пільзэне, Кладно, Усці над Лабем і інш.

РАБОЧАЕ СВЯТА Ў ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 6 верасня. (БЕЛТА). Учора ў ваколіцах Парыжа адбылося арганізаванае рэдакцыяй «Юманітэ» рабочае свята, на якім прысутнічала 300 тыс. чалавек. З прамовамі выступілі Кашэн, Жак Дзюкло і камуністычная дэпутатка іспанскага парлямента Маргарыта Нелькен.

Дзюкло выкрываў ашуканства палітыкі неўмяшання і выставіў патрабаванне захавання міжнароднага права ў адносінах Іспаніі. Прамоўца заявіў, што французскія камуністы будуць дабівацца адзінства, не гледзячы на ўсе перашкоды.

Маргарыта Нелькен перадала прывітанне іспанскага народа і байцоў народнай арміі.

НА ПОШУКІ САМАЛЁТА „Н-209"

ЛЁТЧЫК ЗАДКОЎ АПУСЦІЎСЯ ЛЯ ЛЕДАКОЛА „КРАСИН"

НЬЮ-ЁРК, 6 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва «Асашыэйтэд прэс», з ледакола «Красин», які знаходзіцца ля мыса Бароу (Аляска), атрымана радыёпаведамленне аб тым, што 5 верасня ў 18 гадзін 45 мінут па маскоўскаму часу самалёт лётчыка Задкова апусціўся недалёка ад ледакола. Задкоў 3 верасня з прычыны густога туману быў вымушан зрабіць пасадку ў пункце, размешчаным за 500 міль на поўнач ад стаянкі ледакола.

У АРКТЫЦЫ ДРЭННАЕ НАДВОР'Е

У Арктыцы па-ранейшаму дрэннае надвор'е. Нізкая воблачнасць над архіпелагам Зямлі Франца-Іосіфа затрымлівае на мысе Жэланія гатовую да пералёту на востраў Рудольфа экспедыцыю Героя Савецкага Саюза тав. Шэвелёва.

* * *

Герой Савецкага Саюза тав. Галавін вылецеў на лятаючай лодцы з Дудзінкі ў Оленёк.

ЗАТРЫМАННЕ ЯПОНСКАГА УЗБРОЕНАГА КАТЭРА Ў СОВЕЦКІХ ВОДАХ

ХАБАРАЎСК, 6 верасня. (БЕЛТА). 5 верасня ў 14 гадзін 15 мінут нашы пагранічныя караблі, якія нясуць дазорную службу, затрымалі стаяўшы ў нашых водах на якары, на адлегласці 2¼ міль ад берага паміж востравам Фуругельм і вуспем ракі Тюмень-Ула, узброены японскі катэр «Осака-Мару». Затрыманы катэр двухмачтавы, з жалезным корпусам, афарбован у сталёвы колер, водазмяшчэннем каля 150 тон. На катэры былі выяўлены: станкавы кулямёт, вінтоўкі, рэвольверы і ваеннае снаражэнне. Каманда катэра складаецца з 13 японцаў і 3 карэйцаў, пад камандай японца Маіда. У складзе экіпажа ёсць таксама перакладчык рускай мовы. На першым допыце капітан і перакладчык паказалі, што катэр быў паслан японскім генерал-губернатарствам у Карэі ў нашы воды нібыта для кантралявання дзейнасці карэйскіх рыбалоўных суднаў і нядопуску іх заходу ў совецкія тэрытарыяльныя воды. Гэта заява капітана відавочным чынам не адпавядае сапраўднасці, бо іменна ў раёне стаянкі «Осака-Мару» былі заўважаны дзесяткі японскіх і карэйскіх рыбалоўных суднаў і пры тым нават бліжэй да нашых берагоў, чым стаяў сам «Осака-Мару».

Заслугоўвае ўвагі, што ў бягучым годзе наглядаецца масавы незаконны заход японскіх рыбалоўных шхун і катэраў у совецкія воды, пры чым, галоўным чынам, у тыя раёны, якія не прадстаўляюць каштоўнасці з пункту гледжання рыбалоўства. З гэтага відаць, што сапраўдны мэтай такога масавага заходу японскіх рыбалоўных шхун з'яўляецца зусім не рыбалоўства. Рад шхун затрыман нашымі органамі. Вядзецца следства. Капітаны іх будуць аддаены пад суд.

У ПРЭЗІДЫУМЕ ЦВК СССР

7 верасня адбылося пасяджэнне прэзідыума ЦВК СССР. На гэтым пасяджэнні старшынствуючы тав. М. І. Калінін уручыў раду таварышоў узнагароды за выдатныя заслугі перад краінай.

За ўзорнае выкананне спецыяльных заданняў урада па ўмацаванню абароназдольнасці Совецкага Саюза і праяўлены ў гэтай справе гераізм атрымаў ордэн Леніна і грамату аб прысваенні звання Героя Совецкага Саюза палкоўнік С. П. Дзенісаў.

Затым узнагароды былі ўручаны групе камандзіраў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі за дасягненні ў баявой, палітычнай і тэхнічнай падрыхтоўцы. Выступіўшы з прамовай батальённы камісар тав. Шухардзін выразіў ад імя камандзіраў РСЧА глыбокую падзяку роднаму совецкаму ўраду за высокае давер'е.

Далей ордэны атрымалі работнікі пракуратуры СССР, узнагароджаныя ў сувязі з 15-годдзем пракуратуры, а таксама будаўнікі канала Масква—Волга і іншыя. За асабістыя баявыя подвігі ў перыяд грамадзянскай вайны ордэн Чырвонага сцяга ўручан былому камандзіру батарэі 3-га лёгкага артылерыйскага дывізіёна 9-ай стралковай дывізіі Г. К. Вартэк.

Ад работнікаў пракуратуры з кароткай прамовай выступіў таз. Леплеўскі, ад будаўнікоў канала — тав. Свердлоў.

М. І. Калінін, віншуючы таварышоў з узнагародай, выразіў надзею, што гэта ўзнагарода паслужыць стымулам для далейшых поспехаў у іх рабоце.

* * *

На гэтым-жа пасяджэнні прэзідыума заслухана паведамленне сакратара ЦВК СССР тав. Горкіна аб перапрыемствах па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Па рэспубліках, краях і абласцях, як сказаў тав. Горкін, зараз намячаюцца зыбарчыя акругі. Устаноўлены формы розных дакументаў: шчотныя лісты, выбарчыя бюлетэні, пратаколы галасавання і інш. Згатаўляюцца канверты для выбарчых бюлетэняў. Гэтыя бюлетэні, у адпаведнасці з Палажэннем аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, будуць надрукаваны на мовах нацыянальнасцей, якія ўваходзяць у выбарчыя акругі.

Прэзідыум ЦВК СССР прыняў рад рашэнняў па гэтаму пытанню. У прыватнасці, Наркамлесу даручана паскорыць адгрузку на месцы неабходнай колькасці паперы.

* * *

На гэтым-жа пасяджэнні прыняты сумесныя пастановы ЦВК і Саўнаркома СССР аб змене Палажэння аб падаходным падатку з прадпрыемстваў абагуленага сектара і аб рэарганізацыі спіртавой і водачнай прамысловасці.

(БЕЛТА).

У ЦВК САЮЗА ССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР пастанавіў зняць тав. Любімава І. Е. з паста народнага камісара лёгкай прамысловасці СССР, а тав. Ерэміна І. Г. і тав. Мышкова Н. Г. з пастоў намеснікаў народнага камісара лёгкай прамысловасці, як няспраўдзіўшыхся з работай.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР зацвердзіў тав. Шэстакова В. І. народным камісарам лёгкай прамысловасці СССР, а тав. Сытытава М. С. першым намеснікам народнага камісара лёгкай прамысловасці СССР і тав. Малявіна Г. А. — намеснікам народнага камісара лёгкай прамысловасці СССР.

(БЕЛТА).

ПАСТАНОВА СПАРТЫЎНАЙ КАМІСІІ ЦЭНТРАЛЬНАГА АЭРАКЛУБА СССР імя А. В. КОСАРЭВА АД 7 ВЕРАСНЯ 1937 года

Заслухаўшы даклад спартыўнага камісара Цэнтральнага аэраклуба СССР імя А. В. Косарэва інжынера М. **Крызінскага** і разглядзеўшы прадстаўленыя матэрыялы аб высотным палёце лётчыка-выпрабавальніка М. Ю. **Алексеева** на самалёце «АНТ-40» з двума маторамі па 860 конскіх сіл, зробленым 2 верасня 1937 года з камерцыйным грузам у 1.000 кілограмаў,

пастанавілі:

1. Засвятчыць вышыню, дасягнутую лётчыкам М. Ю. **Алексеевым** на самалёце «АНТ-40» з камерцыйным грузам 1.000 кілограмаў, роўнай 12.246,5 метраў.

2. Прызнаць рэзультат, дасягнуты лётчыкам **Алексеевым** на самалёце «АНТ-40», усесаюзным (нацыянальным) рэкордам зышыні з камерцыйнай нагрузкай 1.000 кілограмаў па класу «С» (сухапутныя самалёты).

3. Прадставіць адпаведныя матэрыялы ў прэзідыум Міжнароднай авіяцыйнай федэрацыі (ФАІ) для засвятчання гэтага рэкорда як міжнароднага па класу «С».

Старшыня спартыўнай камісіі Цэнтральнага аэраклуба СССР камдзіў
Н. УВАРАЎ.
Сакратар Н. МАМІЧЗВА.

ФІНІШ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПЕРАХОДУ МЕНСК—КІЕЎ

КІЕЎ, 5 верасня. **(Па тэлеграфу ад спец. кар. «Звязды»).** Сёння ў 18 гадзін камэндант пераходу Менск—Кіеў у процівагазах і пропітрытных касцюмах пасяжова фініпавала ў Кіеве. За 20 ходавых дзён у цяжкіх умовах каманда прайшла 620 кілометраў.

У Кіеве была арганізавана цёплая сустрэча ўдзельнікам пераходу, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі гаркома КП(б)У, ЦС АСО УССР, рабочыя швейных фабрык, хатнія гаспадыні груп самаабароны, прызыўнікі.

На мітынгу ад каманды выступіў тав. Элентух, які перадаў прывітанне працоўным Кіева і расказаў аб трох пераходах, зрабіўшых рабочымі фабрыкі «Кастрычнік».

Шостага верасня каманда глядзела красачную дэманстрацыю моладзі Кіева, прысвечаную XXIII Міжнароднаму юнацкаму дню.

ВІШНЕЎСКІ.

ВЫКЛАДАННЕ АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ Ў ШКОЛАХ

У 1937—38 навучальным годзе ў 10 школах Менска ў пятых класах уводзіцца вывучэнне англійскай мовы. У школах іншых гарадоў рэспублікі вывучэнне англійскай мовы ў 5-х класах будзе праводзіцца ў залежнасці ад наяўнасці выкладчыкаў.

ДРУЖБА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ З КАЛГАСНІКАМІ

БАБРУЙСК. Дружна і весела праводзяць вольны час байцы і камандзіры часці, якой камандуе тав. Выдрын разам з рабочымі соўгаса і калгаснікамі. Кожны вечар моладзь і байцы збіраюцца, каб паслухаць гутаркі палітработнікаў. Ваенком часці тав. Отжуноў арганізаваў даклады аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР, аб міжнародным становішчы і т. д.

Пасля гутарак і даклада калгасная моладзь і байцы наладжвалі гульні і танцы, глядзелі кінокарціны.

—○—

ПАВЕДАМЛЕННЕ

10 верасня 1937 года ў 9 гадзін раніцы ў Доме партактыва адбудзецца семінары з адрывам ад вытворчасці для прапагандыстаў па гісторыі ВКП(б) па наступных тэмах:

1, 3, 6, 7, 9.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

ГЕРАІЧНАЯ СТАРОНКА МІНУЛАГА

БАРАДЗІНСКІ БОЙ

7 верасня споўнілася 125-ая гадавіна гістарычнага Барадзінскага бою — славутага бою рускай арміі з арміяй Напалеона I на подступах да Масквы.

К часу вайны 1812 года дзяржаўная ўлада ва Францыі знаходзілася ў руках буйнай буржуазіі. Ваенны дыктатар Напалеон Банапарт насіў тытул імператара Францыі. Што прадстаўляў сабой напалеонаўскі ўрад? «Буржуазны ўрад, які задушыў французскую рэволюцыю і захаваў толькі тыя рэзультаты рэволюцыі, якія былі выгадны буйнай буржуазіі» (І. Сталін).

Напалеон перажываў росквіт сваёй славы. Усе буйнейшыя дзяржавы Еўропы былі яго васаламі.

Напалеон прымусіў Александра I па Тільзіцкаму мірнаму дагавору прычыніць удзел у кантынентальнай блакадзе Англіі, якая была яго галоўным суперкам у барацьбе за гегемонію ў Еўропе. Гэта блакада была вельмі нявыгодна рускім памешчыкам і купцам, бо Англія з'яўлялася галоўным спажыўцом рускага лесу, хлеба, канапель і інш. прадуктаў. Парушэнне Расіяй блакады і з'явілася адной з галоўных прычын выступлення Напалеона супроць Расіі. У вайне 1812 года Напалеон разлічваў разграміць нашу краіну, пазбавіць яе самастойнасці, устанавіць сваё поўнае панаванне на ўсім еўрапейскім кантыненце.

У чэрвені 1812 года напалеонаўская армія, больш чым у 500 тысяч салдат, пры амаль паўтара тысячах палявых і асадных гармат, перайшла рускую граніцу. Нацыянальны склад гэтай арміі быў вельмі рознашэрсным. Напалеон рушыў у Расію войскі заваяваных еўрапейскіх краін. Апрача французскіх часцей у яго арміі былі аўстрыйскія, баварскія, саксонскія, вестфальскія, прускія, італьянскія і польскія войскі. Гэтай арміі наша краіна ў пачатку ваенных дзеянняў магла прапіставіць толькі каля 200 тысяч чалавек.

Напалеон, рашыўшы скарыстаць незахопы гэтага плана і разбіць на частках разрозненыя сілы рускай арміі, уразаў свае войскі клінам паміж I і II рускімі арміямі Абодва рускія палкаводцы — Барклай і Багратыён правільна ацанілі манеўр Напалеона, своечасова адмовіліся ад плана Пфуля, і адступаючы да Смаленска, пайшлі на злучэнне адзін з другім. Спроба Напалеона разбіць гэтыя арміі па адзіночцы не ўдалася. Адступіўшы, яны злучыліся пад Смаленскам, дзе для забеспячэння гэтага злучэння быў дан кровепралітны бой, які каштаваў Напалеону 20 тысяч салдат.

29 жніўня (17 жніўня ст. стылю) у рускую армію прыбыў нованазначаны галоўнакамандуючы генерал-фельдмаршал Міхаіл Іларыёнавіч Галенішчэў-Кутузаў, саратнік вялікага палкаводца Суворава. Александр I з вялікай неахотай згадзіўся на гэта назначэнне: вядома, што слаўны палкаводзец быў у няміласці ў цара.

Войскі з натхненнем сустрэлі прыбыццё галоўнакамандуючага. «У арміі па гэтаму поваду была вялікая радасць... Прыбыццё Кутузава зноў прабудзіла ў войсках пачуццё давер'я». — піша ў сваіх успамінах аб 1812 годзе Клаузевіц. Спачатку Кутузаў пратаўжаў тактыку асцярожнага Барклая дэ Толі, які справядліва апасаўся, што ў адкрытым баю перавышчючыя колькасна войскі Напалеона раздавяць рускія сілы.

3 верасня руская армія падышла да сяла Барадзіна, размешчанага на захад ад Мажайска, за сто кілометраў ад Масквы. Адступленне праводзілася ў строгім парадку, праціўніку не даставалася ні аднаго трафея.

Узрастаў народны гнеў супроць непрыяцеля, разараўшага родную краіну. І не гледзячы на тое, што пад Барадзіным напалеонаўская армія ўсё яшчэ колькасна перавышала рускую, вялікі рускі палкаводзец Кутузаў прыняў рашэнне даць захватчыку бой на подступах да сталіцы.

У чаканні бою пазіцыя рускіх войск была ўмацавана двума батарэямі ля вёскі Горкі, цэнтральнай батарэяй на ўзгорку ў цэнтры размяшчэння рускіх войск (так называемая батарэя Раеўскага), трыма флешамі каля вёскі Семёнаўскай (флешы — насыпныя земляныя ўмацаванні) і пяцівугольным рэдутам на 12 гармат, узведзеным на кургане каля вёскі Шэвардзіно. Усе гэтыя ўмацаванні былі пабудаваны на правым беразе рэчкі Калочы. К моманту пачатку бою ўмацаванні не былі дабудаваны да канца, бо пабудова іх пачалася вельмі позна пры недахвацце шанцавага інструмента.

5 верасня перадавыя часці напалеонаўскіх калон наткнуліся на шэвардзінскі рэдут, высунуты наперад як перадавы пункт рускіх умацаванняў. Пасля кровепралітнага бою, у часе якога рэдут некалькі раз пераходзіў з рук у рукі, у ноч на 6 верасня рэдут быў пакінут рускімі войскамі. Каля занятага рэдута, на ўзгорку налазіў сваю стаўку Напалеон для нагляду за Барадзінскім боем. Увесь дзень 6 верасня прайшоў у падрыхтоўцы да рашаючай схваткі.

7 верасня са світаннем разыграўся галоўны бой. Калі рассеяўся праранішні туман, Напалеон, указваючы на ўзыходзячае сонца, сказаў: «Сёння крыўдна хо-лапна, але ясна Гэта сонца Аўстэрліца».

Загрухаталі тысячы гармат. Войскі італьянскага віцэ-караля Еўгенія Багарнэ атакавалі сяло Барадзіно.

Адначасова на левым флангу велізарныя сілы французаў, дывізіі генералаў Компана і Дэссо (корпус Даву) ярасна атакавалі семёнаўскія флешы, абаронай якіх камандаваў Баграціён. Абараняўшыя флешы войскі праявілі здзіўляючую стойкасць і храбрасць і адбівалі адну за другой атакі напалеонаўскай арміі. Пасля другой атакі генерал Компан быў забіт.

Бой цягнуўся ўжо каля 6 гадзін. Каля флешаў выраслі горы мёртвых цел. 7 атак, адна ярасней другой, адбіты. Нарэшце, к поўдню Напалеон сканцэнтраваў ля баграцыёнавых флешаў 30.000 салдат супроць 18.000 рускіх. Часці непрыяцеля ўварваліся ва ўмацаванне.

Удзельнік бою ваенны гісторык Д. П. Бутурлін у кнізе «История нашествия Наполеона в России в 1812 году» так апісвае баі за аўладанне флешамі: «700 агнядышачых жэрл, на прасторы не больш адной квадратнай вярсты сабраных, абстрэльвалі ва ўсіх напрамках невялікую раўніну... і зрылі смерць у грамады абаранаючыхся і нападаючых...

У гэты час дывізіі генералаў Брусье і Марана атакавалі ўзгорак з батарэяй Раеўскага. Тут разгараліся найбольш кровепралітныя баі.

Барадзінскі бой падыходзіў к канцу. Фронт рускіх войск некалькі падаўся назад, страты з абодвух бакоў дасягалі нечуваных памераў, але сіла рускай арміі не была зломлена.

Наглядаючы з высаты за рускімі войскамі, Напалеон пераканаўся, што яны трымаюцца з ранейшай стойкасцю. Між тым яго рэзервы былі ўжо скарыстаны, свежай аставалася адна толькі гвардыя. Аднак, Напалеон не рызыкнуў кінуць свой апошні рэзерв «за 3.000 вёрст ад Францыі» на грознае, захаваўшае сваю баявую магутнасць, рускае войска.

Згодна выражэння Ермолава, пры Барадзіне «французская армія расшыбалася аб рускую». У дакладзе аб Барадзінскім баі Кутузаў пісаў: «...Войскі біліся з неімавернай храбрасцю. Батарэі пераходзілі з рук у рукі і скончылася тым, што непрыяцель ніадзе не выйграў ні на крок зямлі з пераважнымі сваімі сіламі... У непрыяцеля ўзяты палонныя і гарматы і адзін брыгадны генерал. Цяпер ноч і не магу яшчэ разабрацца, ці ёсць з нашага боку такая страта»...

Успаміны аб Барадзіне цяжарам ляжаў над Напалеонам, як кашмар. У сваіх мемуарах ён пісаў: «З усіх маіх баёў самы жахлівы той, які даў я пад Масквой. Французы ў ім паказалі сябе дастойнымі атрымаць перамогу, а рускія атрымалі права быць непераможнымі. З 50 баёў, мною даных, у бітве пад Масквою выказана найбольшая доблесць і атрыман найменшы поспех».

Вялікія страты і адсутнасць рэзерваў прымусілі Кутузава даць загад аб далейшым адступленні, і ўсё-ж выход Барадзінскага бою быў пачаткам паражэння Напалеона. Яго войскі дасягнулі Масквы, але яны непадоўга затрымаліся ў спаленым жыхарамі горадзе. Вакол Масквы з'явіліся рускія партызанскія атрады, нападаўшыя на транспарты напалеонаўскай арміі. З прыбліжэннем зімніх халадоў Напалеон пакінуў сталіцу і адступіў па старой Смаленскай дарозе, зведванай пры паходзе на Маскву. У снежні жалкія астаткі напалеонаўскай арміі ў колькасці каля 30 тыс. чал. перайшлі Бярэзіну, пакінуўшы межы нашай краіны.

Рускі народ адстаяў у вайне 1812 года сваю незалежнасць. Партызанскія атрады, прыгонныя сяляне, адзетыя ў салдацкія мундзіры, разбілі найманнейшую армію свету і прагналі захватчыкаў.

Аб вайне 1812 года і сёння не шкодзіць успомніць тым фашысцкім дзяржавам, якія будуюць планы адрыву чужых тэрыторый. 125 год назад наша краіна, пры ўсёй яе беднасці і адсталасці, усё-ж адбіла напіск наймацнейшай у той час арміі.

У надыходзячых схватках увесь наш вялікі народ, тэхнічна аснашчоная магутная Чырвоная Армія грудзьмі стануць на абарону завяванняў Сталінскай Канстытуцыі, на абарону шчаслівай і свабоднай сацыялістычнай радзімы. Інтэрвенты будуць біты на зямлі той краіны, адкуль яны пасмеюць пасягнуць на нашы граніцы.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
тэл. 24-905
11 ВЕРАСНЯ
АДКРЫЦЦЕ СЕЗОНА
1937—1938 г.
Прымаюцца заяўкі на пастаянныя месцы.
Падрабязнасці ў афішах.

Памяшканне Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР. (Тэл. 24-122)

Адкрыццё зімовага сезона Дзяржаўнага тэатра МУЗКАМЕДЫІ БССР
8 верасня
МІЛЕКЕР
„НИЩИЙ СТУДЕНТ"
Аперэта ў 3-х дзеях.

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка»
ПЁТР ПЕРШЫ
На летняй эстрадзе — канцерты, эдда.

Дзіцячы гукавы кінатэатр
ФЕДЗЬКА

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал»
ЛУННЫ КАМЕНЬ

Гукавы кінатэатр «Спартак»
ПАДРУГІ

Уп. Галоўлітбела № К—3038. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К., Б., Б.